Спецыялісты мяркуюць, што ўраджай баравікоў, абабкаў і падасінавікаў па ўсіх абласцях чакаецца сярэднім, а вось лісічак і восеньскіх апенек — высокі.

СТАР. 2

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Каранямі абрад «Свяча» адыходзіць да найстаражытнейшага культу свяшчэннага агню... Свячой у большасці вёсак называюць ікону, што належыць усім жыхарам вёскі.

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЧЭРВЕНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 118 (27483) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«МЫ РАДЫ ПАШЫРЭННЮ КАНТАКТАЎ У РОЗНЫХ КУТКАХ ПЛАНЕТЫ»

Беларусь выбрала шматвектарны курс знешняй палітыкі і імкнецца да фарміравання трывалых адносін, заснаваных на ўзаемавыгадным супрацоўніцтве і дружбе з замежнымі партнёрамі. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў 27 чэрвеня, прымаючы даверчыя граматы паслоў замежных дзяржаў, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Даверчыя граматы кіраўніку беларускай дзяржавы ўручылі дыпламаты з Украіны, Фінляндыі, Харватыі, Чарнагорыі, Босніі і Герцагавіны, Швейцарыі, Егіпта, Рэспублікі Карэя, Непала, Тайланда і Новай Зеландыі.

«Вельмі сімвалічна, што ваша адказная місія пачынаецца напярэдадні нашага галоўнага дзяржаўнага свята — Дня Незалежнасці. З ліпеня — святая для беларусаў дата вызвалення Мінска ад гітлераўскай акупацыі, стаўшая сімвалам незалежнасці беларускай дзяржавы. Гістарычная памяць аб стойкасці і гераізме нашага народа ў барацьбе з фашызмам, аб тых незлічоных ахвярах, прынесеных на алтар Вялікай Перамогі, аб'яднала людзей, вызначыла светапоглядныя ўстоі і маральныя каштоўнасці нацыі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да дыпламатаў.

Даверчыя граматы ўручыў Прэзідэнту пасол Украіны Міхаіл Ежэль.

Фота БЕЛТА.

«Паважанне права кожнага народа выбіраць свой шлях развіцця, міралюбнасць і салідарнасць, узаемаразуменне і супрацоўніцтва, непрыманне дыктату і несправядлівасці — усе гэтыя выпакутаваныя прынцыпы ляжаць у аснове нашага жыцця. Яны фарміруюць і падыходы Беларусі ў міжнародных адносінах, вызначаюць курс знешняй палітыкі нашай маладой і суверэннай дзяржавы. Таму не выпадкова Беларусь карыстаецца заслужанай рэпутацыяй донара рэгіянальнай і глабальнай бяспекі», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў актывізацыю дзелавога жыцця і ўзнікненне новых сфер узаемных інтарэсаў. «Мы рады пашырэнню кантактаў у розных кутках планеты, з'яўленню новых сяброў і партнёраў. Але асабліва цэнім тых, каму давяраем, з кім пастаянна супрацоўнічаем, маем добрыя традыцыі дружалюбных адносін», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Перш за ўсё, хачу адзначыць цвёрдую прыхільнасць да ўмацавання сувязей з Украінай — нашым бліжэйшым суседам і вельмі надзейным партнёрам. Мой нядаўні афіцыйны візіт ва Украіну яшчэ раз пацвердзіў узаемную зацікаўленасць і імкненне дзяржаў канструктыўна вырашаць актуальныя пытанні», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пытанні развіцця ўзаемаадносін з краінамі Еўропы нязменна знаходзяцца ў цэнтры ўвагі беларускага боку. У прыватнасці, Беларусь разлічвае на паглыбленне інвестыцыйнага супрацоўніцтва з Фінляндыяй і Швейцарыяй.

Прэзідэнт падкрэсліў, што адносіны Беларусі з Рэспублікай Карэя традыцыйна вызначаюцца імкненнем бакоў да канструктыўнага дыялогу, а ў бягучым годзе новай тэмай гэтага дыялогу стала інфарматызацыя. Як адзначыў Прэзідэнт, у Беларусі ўважліва сочаць за развіццём падзей у Егіпце і разглядаюць гэту дзяржаву ў якасці аднаго з ключавых партнёраў у Паўночнай Афрыцы, актыўнага і ўплывовага ўдзельніка працэсу ўрэгулявання няпростых рэгіянальных праблем.

Паводле слоў Прэзідэнта, Беларусь таксама нарошчвае сваю прысутнасць у Паўднёва-Усходняй Азіі, Аўстраліі і Акіяніі.

Звяртаючыся да дыпламатаў, Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што ўжо на пачатковым этапе сваёй дзейнасці ў Беларусі яны змогуць пераканацца ў шчырай нацэленасці беларускага боку на паважлівы і канструктыўны дыялог. «З боку беларускіх партнёраў вы сустрэнеце імкненне да плённай і выніковай сумеснай працы і гатоўнасць да вырашэння любых актуальных пытанняў. Няхай нашы адносіны з краінамі, якія вы прадстаўляеце, стануць дастойным прыкладам дружбы і сапраўднага дзелавога партнёрства», — пажадаў Аляксандр Лукашэнка.

ВЯЛІКАЯ ЕЎРАПЕЙСКАЯ

Што мы ведаем пра Беларусь у Першай сусветнай вайне?



Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

Лясныя могілкі каля Забароддзя.

У наступным годзе будзе адзначацца адна з трагічных і драматычных дат сусветнай гісторыі — 100-годдзе з дня пачатку Першай сусветнай вайны. Аднак ці ведаем мы, колькі людзей і чаму страціла тады Беларусь? Ці маем уяўленне, якія баі ішлі на нашых землях і якое значэнне мелі падчас сусветных падзей? Крочачы па родных мясцінах, ці разумеем, што яны моцна ўсыпаны кулямі і паліты крывёй, бо лінія фронту праходзіла менавіта тут? Каб атрымаць адказы на гэтыя пытанні, а таксама дзеля рэанімацыі ўласнай памяці пра той час і сваіх прапрадзедаў, мы адправіліся ў вёску Забароддзе Вілейскага раёна да мастака Барыса Цітовіча. Бо менавіта там знаходзіцца адзіны ў краіне музей Першай сусветнай вайны. Напачатку мы падышлі да капліцы-помніка Барыса і Глеба, нябесных заступнікаў воінства, якая была пабудавана тут у 2004 годзе. Каплічка быццам цягнулася ўверх, заклікала паглядзець на нябёсы... На акуратны драўляны дах села птушка, якую мастак ласкава паклікаў: «Крыставушка». Цітовіч папрасіў — тая і заспявала. «Часам яна і на крыж садзіцца, — кажа ён, — заліваецца, усхваляе Госпада».

СТАР. 6

ЛІЧБА ДНЯ

23 тыс. 926 шлюбаў

зарэгістравана ў краіне за студзень—май гэтага года. Колькасць новых сямейных саюзаў павялічылася ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам на 18,7%. Калі сёлета ў студзені—маі на 1000 жыхароў рэспублікі прыпадала 6,1 шлюбу, то ў студзені—маі мінулага года гэты паказчык быў роўны толькі 5,1. Паводле аператыўных даных Белстата, у краіне памяншаецца колькасць разводаў: у студзені—маі 2013-га скасавана 14 тыс. 582 шлюбы. Разводаў стала менш на 13,3% у параўнанні са студзенем—маем 2012 года. Паказчык разводаў знізіўся, адпаведна, з 4,3 на 1000 жыхароў да 3,7.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.06.2013 г.

Долар ЗША	8790,00	▲
Еўра	11450,00	▼
Рас. руб.	267,50	▲
Укр. грыўня	1077,93	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 15°
Віцебск	+ 26°
Гомель	+ 30°
Гродна	+ 14°
Магілёў	+ 28°
Мінск	+ 25°

■ Анонс

«ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА: ПАМЯЦЬ ЖЫВЕ Ў БЕЛАРУСІ»

Набліжаецца трагічная дата... 28 ліпеня 2014 года ўвесь свет адзначыць 100-годдзе пачатку аднаго з самых кровапралітных і маштабных узброеных канфліктаў у гісторыі чалавецтва — Першай сусветнай вайны.

Прайшло цэлае стагоддзе, а адгалоскі той вайны і сёння бударажаць людскія сэрцы. Пошукавыя атрады знаходзяць астанкі герояў і іх трафеі. Неабыякавыя людзі ўвекавечваюць іх подзвіг у помніках, кнігах...

Толькі ці шмат мы ведаем пра «імперыялістычную вайну» сёння? На жаль, белых плям тут больш, чым можа падацца. Толькі так быць не павінна. Невыпадкова гісторыкі і проста энтузіясты ўласнымі намаганнямі спрабуюць аднавіць гістарычную праўду аб Першай сусветнай вайне, робяць усё для таго, каб падзеі 1914—1918 гадоў не зніклі з людской памяці.

Пра гэта нельга забываць, і тым больш пра гэта яшчэ ёсць што сказаць. Падчас пасяджэння «круглага стала» газеты «Звязда» і аналітычнага цэнтра EcooM, якое адбудзецца сёння ў 14.00 у Грамадскім прэс-цэнтры «Дома прэсы», гісторыкі і неабыякавыя да гэтай тэмы людзі ўзгадаюць тыя трагічныя падзеі, абмяркуюць пытанні захавання гістарычнай памяці і адкрыюць малавядомыя старонкі нашай гісторыі.

Каб размова атрымалася паўнавартаснай, запрашаем прыняць у ёй удзел і вас, паважаныя чытачы! Вашы пытанні будуць агучаны падчас пасяджэння «круглага стала».

Калі ласка, задавайце іх па тэлефонах: 8 (017) 2923121; 8 (029) 8894849 — ці пакідайце свае пытанні на сайце «Звязды» ў раздзеле «Зваротная сувязь».

«ПРАМАЯ ЛІНІЯ» З МІНІСТРАМ ЖКГ

Сёння, 28 чэрвеня, з 11.00 да 12.00 у рэдакцыі газеты «Звязда» пройдзе «прамая лінія» з **міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэем Віктаравічам ШОРЦАМ**.

Ці будуць сёлета расці тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі? Якія віды работ пры капрамонце павінны аплачваць самі жыльцы? Калі ў жыроўцы з'явіцца графа, якая будзе «расшыфроўваць» тэхпаслугі? Колькі будзе каштаваць арэнднае жыллё? На гэтыя і іншыя пытанні адкажа наш суразмоўца.

Тэлефануйце па нумарах **(8-017) 287 18 66 і (8-017) 287 18 71.**

Папярэднія пытанні можна задаваць па тэлефонах **(8-017) 287 18 29 і (8-017) 287 18 69.**

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УКРАІНА: ПАМІЖ ЕС І МС

Большасць украінцаў упэўнена, што ўступленне ў Еўрапейскі саюз павінна быць галоўным інтэграцыйным кірункам Украіны, сведчаць вынікі апытання, праведзенага Фондам «Дэмакратычныя ініцыятывы ім. Ілька Кучэрыва» і сацыялагічнай службай Цэнтра Разумкова. Згодна з вынікамі апытання, за ўступленне ў ЕС выступаюць 42% апытаных, за ўступленне ў Мытны саюз — 31% рэспандэнтаў. Разам з тым, 13,5% украінцаў лічаць, што Украіне не варта далучацца ні да ЕС, ні да МС. Больш арыентавана на еўрапейскі кірунак моладзь (18-29 гадоў) — 54%. Тэрытарыяльна яго больш падтрымліваюць на захадзе Украіны (72%).

ІРАН ПЛАНУЕ ВЫРАБЛЯЦЬ 20 ТЫС. МВТ НА СВАІХ БУДУЧЫХ АЭС

Аб гэтым паведаміў у час выступлення на пленарным пасяджэнні Міжнароднай канферэнцыі МАГАТЭ кіраўнік Арганізацыі па атамнай энергіі Ірана Ферэйдун Абасі Давані. Паводле яго слоў, «развіццё атамнай энергіі краіны будзе ісці па двух шляхах: шляхам заключэння дагавораў і пагадненняў аб будаўніцтве новых атамных энергаблокаў з вядучымі вытворцамі гэтага абсталявання ў свеце і шляхам стварэння прадпрыемстваў па вытворчасці абсталявання для АЭС мясцовымі вытворцамі». Кіраўнік дэлегацыі Ірана таксама ўдакладніў, што «Расія з'яўляецца нашым партнёрам па выпраўленні памылак праекта» Бушэр «і рыхтуецца перадаць нам пабудаваны і гатовы да эксплуатацыі аб'ект». Ён таксама дадаў, што Іран «хутка стане ў адзін шэраг з краінамі, якія маюць дзеючыя атамныя электрастанцыі».

У ЛІТВЕ ЗБІРАЮЦЦА ШТРАФАВАЦЬ ПАКУПНІКОЎ КАНТРАБАНДЫ

Адміністрацыйная адказнасць павінна пагражаць не толькі асобам, якія перавозяць, захоўваюць і распаўсюджваюць акцызныя тавары, але і пакупнікам. Так вырашыў урад рэспублікі, піша Delfi.lt. Плануецца, што штраф можа складаць ад 100 літаў да дзясяткаў тысяч літаў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

КЫРГЫЗСТАН АДМАЎЛЯЕ ЗША Ў ДАЛЕЙШЫМ РАЗМЯШЧЭННІ АВІЯБАЗЫ Ў АЭРАПОРЦЕ БІШКЕКА

Прэзідэнт Кыргызстана Алмазбек Атамбаеў падпісаў закон аб дэнансацыі двух міжурадавых пагадненняў, заключаных у 2009 годзе паміж Кыргызстанам і ЗША. Згодна з законам, прынятым тыднем раней парламентам Кыргызстана, пагадненні аб супрацоўніцтве і аб Цэнтры транзітных перавозак у аэрапорце Манас дэнансуюцца з 11 ліпеня 2014 года.

Пагадненне, якое вызначае парадак знаходжання ў рэспубліцы амерыканскіх вайскоўцаў і знаходжання ў аэрапорце Бішкека амерыканскага Цэнтра транзітных перавозак, было заключана тэрмінам на пяць гадоў. Тэрмін яго дзеяння заканчваецца ў сярэдзіне ліпеня 2014 года.

КАРОТКА

У сувязі з абвастрэннем становішча ў Егіпце Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь рэкамендуе беларускім грамадзянам устрымлівацца ад паездак у егіпецкія гарады, якія знаходзяцца за межамі курортных зон, за выключэннем выпадкаў крайняй неабходнасці.

Па папулярнасці сярод расійскіх турыстаў на постсавецкай прасторы Беларусь уступае толькі Крыму, заявіла ў Маскве выканаўчы дырэктар Асацыяцыі тураператараў Расіі Мая Ламідзэ. Замыкаюць пяцёрку Узбекістан, Казахстан і Арменія, але з вялікім адставаннем ад першых дзвюх пазіцый.

Плату за праезд па некаторых аўтадарогах Беларусі з дапамогай электроннай сістэмы (BelToll) пачнуць спаганяць з 1 жніўня.

Міжнародны форум тэатральнага мастацтва «ТЭАРТ-2013» пройдзе ў Мінску з 28 верасня па 21 кастрычніка.

ЯКІМ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЛЕПШЫ РЭГІЁН ДЛЯ БІЗНЕСУ?

Лідскі раён — пераможца рэспубліканскага конкурсу «Лепшы горад (раён) і вобласць для бізнесу Беларусі — 2013»

Віталь НЯВЕРА, намеснік старшыні Лідскага райвыканкама:

— Лепшы рэгіён для вядзення бізнесу — гэта ў першую чаргу той, дзе жывуць прадпрымальныя, працавітыя і адказныя людзі, дзелавая ініцыятыва якіх дазваляе не толькі самастойна забяспечваць уласны дабрабыт і дастойны ўзровень жыцця, але і актыўна ўдзельнічаць у дынамічным развіцці рэгіёна. Пры гэтым наша задача — аказваць падтрымку дзелавой ініцыятыве, забяспечваць спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі бізнес-ідэй.

На пачатак сёлетняга года ў нашым раёне зарэгістраваны 1112 прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу і больш за 5100 індывідуальных прадпрымальнікаў. Колькасць работнікаў суб'ектаў прадпрымальніцтва складае больш за чвэрць ад агульнай колькасці занятых у эканоміцы раёна. На долю прадпрыемстваў бізнесу прыпадаюць амаль 24 працэнты паступленняў у бюджэт.

Аляксандр ПЕЦІКАЎ, дырэктар прыватнага прадпрыемства «Свет фота», г. Ліда:

— Першая і, напэўна, асноўная ўмова — гэта станоўчае стаўленне ўлад, глыбокае разуменне праблем і, безумоўна, дапамога і падтрымка ў іх вырашэнні. Бо толькі сумеснымі намаганнямі можна эфектыўна змагацца з цяжкасцямі, ствараючы спрыяльныя ўмовы, якія дазваляюць бізнесу развівацца і падымацца на больш высокі ўзровень.

Вядома, усім хацелася б зніжэння падатковай нагрузкі, арэндных і крэдытных ставак. Безумоўна, гэтыя стаўкі аб'ектыўныя і прадыктаваны рэальнай эканамічнай сітуацыяй. І тым не менш такая дапамога была бы вельмі дарэчы — хаця бы на пачатковым этапе развіцця любой фірмы (адзін-два гады).

І трэцяя ўмова — гэта стварэнне няхай нават больш жорсткіх, але роўных умоў, «правілаў гульні» для суб'ектаў гаспадарання розных формаў. Выраўноўванне існуючага дысбалансу садзейнічала бы ўтварэнню і наступнаму ўмацаванню здаровых рынкавых узаемаадносін.

Ірына КУРГАНОВІЧ, дырэктар таварыства «ЭльМодСтыль», г. Ліда:

— Лідчына заўсёды была прывабнай для прыватнага бізнесу. Кіраўніцтва раёна адкрыта для дыялогу з ім і з адабрэннем разглядае цікавыя ідэі. Пры гэтым умовы вядзення бізнесу цяпер намнога спрошчаны, і прадпрымальнікі імкнуцца да пашырэння паслуг і вытворчасці. І гэта цудоўна. Праўда, хочацца, каб крэдытныя рэсурсы былі больш даступныя для развіцця бізнесу.

Падрыхтаваў Барыс ПРАКОПЧЫК.

І КАМЕРЦЫЙНАЯ ВЫГАДА, І... ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЛІТЫКА

Планы супрацоўніцтва беларускіх прадпрыемстваў і «Раскосмаса» будуць рэалізоўвацца на прынцыпова новай аснове. Аб гэтым заявіў учора прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з кіраўніком Федэральнага касмічнага агенцтва Расіі («Раскосмас») Уладзімірам Папоўкіным, перадае БЕЛТА.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што работа з «Раскосмасам» — гэта і камерцыйная выгада, і дзяржаўная палітыка. Яна падтрымліваецца на ўзроўні ўрадаў дзвюх краін. «Гэта залог таго, што нашы планы будуць рэалізоўвацца на прынцыпова новай аснове», — сказаў прэм'ер-міністр Беларусі. «У выніку мы выходзім на ўзровень маёмасных адносін нашых сумесных прадпрыемстваў або ў будучым сумесных», — дадаў Міхаіл Мясніковіч.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што ў час сустрэчы неабходна абмеркаваць пытанні інтэграцыі з беларускім «Пеленгам», і тое, што датычыцца групоўкі новых апаратаў. Размова пойдзе як аб дзеючай групоўцы, так і аб той, якую плануецца ўвесці ў эксплуатацыю праз 3-5 гадоў. «Мы павінны глядзець і на камерцыйны складальнік», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

ПАТРЫЯРХ КІРЫЛ ЗАКЛІКАЎ ВЕРНІКАЎ САБРАЦЬ СРОДКІ ДЛЯ НАРОДА СІРЫІ

«На працягу амаль двух гадоў у Сірыі працягваюцца ваенныя дзеянні. За гэты час у краіне загінулі дзясяткі тысяч чалавек, сярод якіх нямала старых, жанчын, дзяцей — мірных грамадзян, — сказана ў звароце першаіерарха Рускай праваслаўнай царквы, размешчаным на яе афіцыйным сайце і на сайце Беларускай праваслаўнай царквы. — Значную частку сірыйскага народа складаюць нашы з вамі адзінаверцы: у горадзе Дамаску знаходзіцца цэнтр аднаго з найстаражытнейшых праваслаўных патрыярхатаў — Антыяхійскага. І зараз на вуліцах гэтага горада, які памятае апостала Паўла, подзвігі і працу старажытных святых, праліваецца чалавечая кроў. На гэтай біблейскай зямлі, дзе плячо ў плячо ў міры жылі праваслаўныя хрысціяне і мусульмане, сёння апаганьваюцца святыні, хрысціян гоняць з іх жылля, праследуюць, а нярэдка — аддаюць на катаванне і забіваюць».

Патрыярх заклікаў у бліжэйшую нядзелю ва ўсіх храмах Рускай праваслаўнай царквы арганізаваць збор сродкаў для сірыйскага народа. Грашовыя сродкі будуць накіраваны на рахунку Сінадальнага аддзела па царкоўнай дабрачыннасці і сацыяльным служэнні, якому даручана каардынаваць гэтую работу. Па завяршэнні царкоўнага збору сродкі будуць перададзены Антыяхійскаму патрыярхату.

«Мы з вамі не можам спыніць гэтую вайну, але можам шчыра маліцца аб яе хуткім спыненні і аказаць дапамогу пакутным людзям, у тым ліку нашым братам-хрысціянам», — сказана ў звароце.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

СТВОРАНЫ БЕЛАРУСКА-ШВЕЙЦАРСКІ ДЗЕЛАВЫ САВЕТ

Дзеля пашырэння эканамічных сувязяў паміж Беларуссю і Швейцарыяй, стварэння новых сумесных прадпрыемстваў і стымулявання кантактаў прадстаўнікоў бізнесу дзвюх краін у Беларускай гандлёва-прамысловай палаце падпісаны дагавор аб стварэнні беларуска-швейцарскага дзелавога савета. Сустаршынямі яго сталі генеральны дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Электрычны транспарт» Уладзімір Кароль і ўладальнік швейцарскай кампаніі «Штадлер Рэйл Груп» Пітэр Шпулер.

У красавіку такая ініцыятыва была падтрымана падчас сустрэчы кіраўніка «Штадлер Рэйл Груп» з Прэзідэнтам Беларусі. Як паведаміў **першы намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Вячаслаў РЭУТ**, задачай новага савета стане павышэнне эканамічнай рэпутацыі нашай краіны сярод швейцарскіх бізнесменаў, паглыбленне ўзаемадзеяння ў гандлі і інвестыцыях і заахвочванне ў абмене эканамічнай інфармацыяй. Паводле слоў Петэра Шпулера, са стварэннем савета адкрываецца новая магчымасць для работы экспертаў. Як вядома, «Штадлер Рэйл Груп» з'яўляецца партнёрам нашай краіны ў пастаўках гарадскіх і прыгарадных электрацягнікоў, а таксама стваральнікам іх вытворчасці ў Мінскай вобласці сумесна з ААТ «Электрычны транспарт». У якасці перспектыўнага кірунку супрацоўніцтва разглядаюцца хімічная і фармацэўтычная галіна.

Пятро РАМАНЧУК.

ЗА ЎЖЫВАННЕ НАРКАРЭЧЫВАЎ ДАВЯДЗЕЦЦА АДКАЗАЦЬ

Міжнародныя эксперты прызнаюць, што барацьба з наркаманіяй прайграна. Аб гэтым сведчыць распаўсюджанасць наркотыкаў і наркаспажывання ў свеце. І ўсё таму, што размова ішла і ідзе аб вельмі прыбытковым бізнесе. Так, калі 1 тона гераіну ў Афганістане каштуе 9 тысяч долараў, то ў Маскве, скажам, гэта будзе ўжо 150 тысяч. Як бы там ні было, на дзяржаўным узроўні краіны проціпастаўляюць наркаспажыванню неверагодныя намаганні. У нас мяркуецца ісці па шляху ўкаранення больш жорсткіх мер пакарання, прычым нарэшце, размова зайшла аб магчымасці пакарання не толькі тых, хто распаўсюджвае, але і тых, хто спажывае.

Так, Міністэрства ўнутраных спраў выступае з ініцыятывай увядзення за ўжыванне наркотыкаў адміністрацыйнай адказнасці. У «Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях» мы ўнеслі норму аб тым, каб за ўжыванне наркасродкаў, псіхатропных рэчываў і іх аналагаў у грамадскім месцы, наступала адміністрацыйная адказнасць, — кажа намеснік начальніка ўпраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі Васіль ЛОСІЧ. — Нарматыўны акт прайшоў першае чытанне ў парламенце».

Таксама МУС ініцыяваў прадугледжанне пакарання за выраб наркотыкаў ва ўмовах лабараторыі. У краіне апошнім часам расце іх колькасць, як расце і колькасць спецыяльна абсталяваных памяшканняў па вырошчванні канопляў з высокай колькасцю канабіноідаў. Ёсць неабходнасць зрабіць больш сур'ёзнай адказнасць за перамяшчэнне наркотыкаў у межах Мытнага саюза. З моманту ўступлення ў Мытны саюз на тэрыторыі Беларусі было спынена 48 каналаў паступлення наркотыкаў. Галоўным чынам, з расійскага боку.

Пашырыць магчымасці барацьбы праваахоўнікаў з распаўсюджваннем насення маку дапаможа дэкрэт Прэзідэнта, які зараз знаходзіцца на разглядзе ў Савеце Міністраў. «Дэкрэт прадугледжвае магчымасць спагнання штрафу за распаўсюджванне насення маку ў памеры ад 1 да 8 тысяч еўра, — адзначае начальнік упраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі Мікалай КАРПЯНКОЎ. — Прадугледжана нават канфіскацыя кватэры, гаража, аўтамабіля, з дапамогай якіх ажыццяўлялася распаўсюджванне».

Наогул эксперты лічаць, што ў нашай рэспубліцы стабілізавалася сітуацыя з наркаманіяй. Работа вядзецца па чатырох кірунках: недаступнасць наркасыравіны на рынку, ранняя дыягностыка і выяўленне спажыўцоў, павышэнне ўзроўню рэабілітацыі апошніх, а таксама ў галіне навукі і заканадаўства. Разам з тым, толькі сёлета выяўлена 1800 злачынстваў, звязаных з накрабізнесам. 500 злачынстваў звязаны з незаконным абаротам наркарэчывай. На нашым наркарынку прысутнічаюць самыя розныя наркотыкі, гераін і метадон у тым ліку. Але, як запэўніваюць праваахоўнікі, яны на рынку не распаўсюджаны і лёгкадаступнымі іх не назавеш. Галоўным наркотыкам застаецца выраблены з насення маку опій. Другая сур'ёзная праблема — курыльныя сумесі. Для выяўлення гандляроў маніторыцца інтэрнэт, выяўляюцца сайты, на якіх ёсць падобная інфармацыя. «Усе асобы, якія займаюцца распаўсюджваннем курыльных сумесяў, будуць прыцягнуты да адказнасці», — сцвярджае спадар Карпянкоў. Ён таксама заўважыў, што «па марганцоўцы ў нас праблемы няма. Ва Украіне яна надуманая. Абарот марганцоўкі ў высокіх канцэнтрацыях кантралюецца». Увогуле ж размова ідзе пра звычайны «бытавы растваральнік», які проста можа прымяняцца падчас вырабу наркарэчываў.

— Летась агульная колькасць дыспансерных хворых на наркаманію вырасла на 881 чалавека, — расказвае загадчык сектара наркалагічнага маніторынгу Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Аляксей КРАЛЬКО. — Найбольшая колькасць такіх людзей фіксуецца ў сталіцы, на Гомельшчыне. Даволі сур'ёзнай тэмай для размовы становіцца Салігорскі рэгіён.

На пачатак гэтага года ў сталіцы на ўліку ва ўрачоў-нарколагаў стаяла крыху больш за 7 тысяч хворых на наркаманію.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Будзе свята!

БЕГАЦЬ, ЛАВІЦЬ РЫБУ І... ГЛЯДЗЕЦЬ САЛЮТ!

Адзначаць Дзень Незалежнасці ў сталіцы пачнуць яшчэ 29 чэрвеня: у 10 гадзін раніцы з плошчы Незалежнасці стартуюць дабрачынныя лёгкаатлетычныя спаборніцтвы з удзелам Дар'і Домрачавай, Юліі Несцярэнкі, Аляксандры Герасімені. Без мерапрыемстваў не абыдуцца і ўсе астатнія дні перад 3 ліпеня.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Так, 29-30 чэрвеня сталіцу чакае «вялікая рыбалка»: у акваторыі ракі Свіслач гэтымі днямі правядуць адкрыты кубак Мінска па спартыўнай лоўлі рыбы «Кубак RS». Канцэртная праграма святкавання Дня Незалежнасці пачнецца 1 ліпеня ў Палацы Рэспублікі, дзе ў 16.00 выступяць майстры мастацтваў Беларусі. Вечарам наступнага дня, у 20.30, запланавана адкрыццё плошчы Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. А непасрэдна ў Дзень Незалежнасці, 3 ліпеня, святкаванне пачнецца з парада войск Мінскага гарнізона і спартыўна-моладзевага шэсця на праспекце Пераможцаў. У 13 гадзін галоўныя падзеі перанясуцца на пляцоўку каля Палаца спорту, дзе пройдзе свята пад назвай «Ганаруся табой, Беларусь!» А завершыцца Дзень Незалежнасці традыцыйным канцэртам каля стэлы «Мінск — горад-герой» і салютам у 23 гадзіны. Святочная праграма на 3 ліпеня таксама запланавана ў кожным раёне сталіцы.

Гандаль побач з месцамі святочных мерапрыемстваў будзе весціся з мінімальнымі нацэнкамі. Па словах начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Мінгарвыканкама Сяргея Хільмана, выязныя гандлёвыя пункты будуць арганізаваны ў месах масавых гулянняў у раёнах горада, а таксама на буйных агульнагарадскіх і агульнарэспубліканскіх мерапрыемствах.

Ганна ГАРУСТОВІЧ

■ Чакаем!

СЁЛЕТА ПРАГНАЗУЕЦЦА НЕБЛАГІ ЎРАДЖАЙ ГРЫБОЎ І ЯГАД

Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя апублікавала прагнозы адносна ўраджайнасці сёлета грыбоў і ягад у лясах краіны. Яны былі зроблены на падставе маніторынгу, што праводзіўся ўвесну і ў пачатку лета лабараторыяй харчовых і лекавых рэсурсаў лесу Інстытута лесу НАН Беларусі на 7 пастаянных пунктах і 35 часовых пробных пляцоўках.

Даследаванні паказалі, што на поўначы і ў цэнтральных рэгіёнах краіны ўраджай чарніц прагназуецца вышэй за сярэдні (3 балы па пяцібальнай шкале). У Брэсцкай, Гомельскай і Гродзенскай абласцях ён будзе, верагодна, добрым (4 балы). Што датычыцца ўраджайнасці брусніц, дык яна паўсюдна чакаецца некалькі ніжэй за сярэднешматгадовы паказчык (2 балы). У Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях пры спрыяльных умовах надвор'я ўраджай гэтай ягады прагназуецца больш высокім (3 балы).

Прадуктыўнасць буякоў, што мяркуецца, вар'іруецца ў залежнасці ад вобласці: сярэдняя (3 балы) — на поўначы і ў цэнтральнай частцы краіны, добрая (4 балы) — у паўднёва-заходніх абласцях. Добрая (4 балы) ураджайнасць журавін чакаецца ў Брэсцкай, Віцебскай і Гомельскай абласцях. Менш (3 балы) гэтай ягады будзе, верагодна, у Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях.

Увогуле, адзначаюць спецыялісты, сёлета ўраджайнасць рэсурсаўтваральных ягад і грыбоў, згодна з папярэднімі (май — чэрвень) данымі даследаванняў, будзе не меншай за папярэдні. Для гэтага існуюць усе перадумовы: высокі і ўстойлівы снегавы покрыў 2012/2013 гадоў, шмат ападкаў у шэрагу рэгіёнаў, адсутнасць позневеснавых замаразкаў і туманаў. «Можна нават выказаць меркаванне, што адбудзецца павялічэнне ягаднай прадуктыўнасці за кошт павышэння ўраджайнасці журавін, брусніц, буякоў».

З-за добрай колькасці вільгаці вясной і магутных ліўневых дажджоў у маі — пачатку чэрвеня намячаецца неблагі ўраджай грыбоў. Гэта, у першую чаргу, датычыцца Мінскай, Гомельскай і Гродзенскай абласцей. У пачатку чэрвеня тут адзначана першая хваля баравікоў, абабкаў, падасінавікаў, маслякоў, лісічак. У далейшым, вядома, шмат што будзе залежаць ад умоў надвор'я. Пакуль жа спецыялісты мяркуюць, што ўраджай баравікоў, абабкаў і падасінавікаў па ўсіх абласцях чакаецца сярэднім (2 балы па трохбальнай шкале), а вось лісічак і восеньскіх апенек — высокі (3 балы). Пры дастатковай колькасці вільгаці летам (асабліва ў жніўні) ураджай усіх відаў грыбоў можа быць больш высокім.

Сяргей РАСОЛЬКА

Фота Пятра ФАМІНА.

■ Зваротная сувязь

АЎТОБУСЫ ІДУЦЬ... І СПЫНЯЦЦА БУДУЦЬ

«Аўтобусы праходзяць, але... не спыняюцца». Пад такім загалоўкам 29.05.2013 г. у газеце быў змешчаны ліст Івана Казлоўскага. Іван Іванавіч (дарэчы, шчыры прыхільнік «Звязды») ад імя ўсіх сваіх землякоў хадайнічаў аб арганізацыі прыпыначнага пункта ў былым мястэчку Вішнявец Стаўбцоўскага раёна.

Як паведамілі ў адказе на публікацыю намеснік генеральнага дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскаблаўтатранс» Я.В. Ігнатаў і намеснік міністра транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь А.А. Шышко, пытанне, якое ўзнімалі вяскоўцы, разгледжана. Цяпер для ажыццяўлення паездак з Мінска ў в. Вішнявец можна скарыстацца аўтобусамі «Мінск — Клецк» і «Мінск — Нясвіж». Акрамя таго, па маршрутах «Нясвіж — Стоўбцы», «Стоўбцы — Ахрэмавічы» арганізаваны транспартныя зносіны з раённым цэнтрам. Іншымі словамі, нарматывы дзяржаўных сацыяльных стандартаў у галіне транспартнага абслугоўвання насельніцтва в. Вішнявец выконваюцца ў поўным аб'ёме.

Што да пытання аб увядзенні дадатковых прыпыначных пунктаў ва ўсе расклады руху, то (цытуем) «...адным з важных паказчыкаў, якія вызначаюць якасць абслугоўвання пасажыраў, з'яўляецца хуткасць руху аўтобусаў. Яе значэнне залежыць ад цэлага шэрагу фактараў — дарожных і кліматычных умоў, планіроўкі населеных пунктаў, інтэнсіўнасці руху і г.д. Перавышэнне сярэдняй дальнасці паездкі пасажыраў на міжгародніх маршрутах сведчыць аб мэтазгоднасці арганізацыі хуткасных або экспрэсных рэжымаў руху. Прыпыначныя пункты пры арганізацыі такіх маршрутаў усталёўваюцца ў месцах найбольшага пасажыраабмену з мэтай скарачэння агульнага часу на паездку не менш за 20—25% у параўнанні з аўтобусамі, якія працуюць у звычайным рэжыме.

Увядзенне дадатковых тарыфных прыпыначных пунктаў ва ўсе расклады руху аўтобусаў, якія выконваюць міжгароднія аўтамабільныя перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах, павялічвае час руху аўтобуса, што прычыняе пэўныя нязручнасці пасажырам, якія едуць на далёкія адлегласці, і выклікае іх справядлівыя нараканні. Адток часткі пасажыраў па прычыне павелічэння часу ў дарозе негатыўным чынам адбіваецца на напаўняльнасці аўтобуса і, як вынік, на эканамічнай эфектыўнасці яго эксплуатацыі.

Разам з тым, пытанне, выкладзенае ў калектыўным звароце, прапрацавана з удзелам прадстаўнікоў арганізацый, якія выконваюць перавозкі пасажыраў у вышэйзгаданым напрамку. У выніку, з 12 ліпеня 2013 г. плануецца ўвесці тарыфны прыпыначны пункт «Вішнявец» у расклад руху аўтобусаў па маршрутах «Мінск — Пінск» (час адпраўлення з г. Мінска ў 12.00, 15.40, 17.30), «Мінск — Альшаны» (час адпраўлення з г. Мінска ў 10.00)».

Іншымі словамі, у хуткім часе гэтыя аўтобусы праз Вішнявец будуць не толькі праходзіць, — яны там будуць спыняцца.

На што, уласна, і спадзяваліся жыхары былога мястэчка і яго ваколіц, дасылаючы ліст у рэдакцыю.

■ Кватэрнае пытанне

МАЛАДАЯ СЯМ'Я — НЕ ШМАТДЗЕТНАЯ...

Мы жывём у доме, пабудаваным сельгасарганізацыяй, і хацелі б выкупіць яго з пераводам на нас запазычанасці па льготным крэдыце. Ці можна ў гэтым выпадку разлічваць на фінансавую дапамогу ў яго пагашэнні як маладой сям'і, у якой гадуецца малое дзіця?

С. Ляхаў, *Віцебскі р-н*

У адпаведнасці з падп. 1.4 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2005 № 405 «Аб некаторых мерах па будаўніцтве жылых дамоў (кватэр) у сельскагаспадарчых арганізацыях» (далей — Указ № 405) сельскагаспадарчыя арганізацыі, іншыя юрыдычныя асобы могуць ажыццяўляць перавод доўгу па льготных крэдытах, атрыманых імі ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Белаграпрамбанк» на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылога дома (кватэры), рэканструкцыю аб'екта пад жылое памяшканне, на грамадзяніна, якому гэты жылы дом (кватэра, жылое памяшканне) выдзелены для пражывання, па заяве гэтага грамадзяніна.

Перавод доўгу па такім крэдыце павінен ажыццяўляцца, зыходзячы з плацежаздольнасці грамадзяніна са згоды адкрытага акцыянернага таварыства «Белаграпрамбанк» з выплатай працэнтаў за карыстанне гэтым крэдытам у памеры 10% ад стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка, якая дзейнічае на дату пераводу доўга па льготным крэдыце, але не менш за 3% гадавых, і тэрмінам пагашэння крэдыту з моманту яго выдзялення — не больш за 20 гадоў. Для шматдзетных сямей стаўка за карыстанне крэдытам устаноўлена ў памеры 1% гадавых, а тэрмін пагашэння крэдыту — не больш за 40 гадоў. Пагашэнне запазычанасці па гэтым крэдыце і выплата працэнтаў за карыстанне ім ажыццяўляюцца роўнымі долямі на працягу перыяду пагашэння крэдыту.

Што датычыцца фінансавай дапамогі дзяржавы ў пагашэнні запазычанасці, то такая дапамога аказваецца на ўмовах і ў парадку, вызначаных ва Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2012 г . № 13 «Аб некаторых пытаннях аказання грамадзянам дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылых памяшканняў».

У прыватнасці, шматдзетным сем'ям фінансавая дапамога аказваецца ў наступных памерах: пры наяўнасці траіх непаўналетніх дзяцей — 75% ад сумы запазычанасці, пры наяўнасці чацвярых і больш непаўналетніх дзяцей — 100% ад сумы запазычанасці па выданых крэдытах.

Маладым сем'ям фінансавая дапамога аказваецца пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) першага дзіцяці ў памеры 10% ад сумы запазычанасці і пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) другога дзіцяці — 20% ад сумы запазычанасці па выданых крэдытах.

Такім чынам, у адрозненне ад шматдзетных, маладым сем'ям фінансавая дапамога пры пагашэнні крэдыту аказваецца не пры наяўнасці непаўналетніх дзяцей, а ў выпадку іх нараджэння.

Віктар САВІЦКІ

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

У НАВАГРАДКУ АДРЭСТАЎРЫРУЮЦЬ ІНТЭР'ЕР ФАРНАГА КАСЦЁЛА

У Навагрудку плануюць адрэстаўрыраваць інтэр'ер касцёла Праабражэння Гасподняга (Фарны касцёл), паведамілі ў Гродзенскай рымска-каталіцкай епархіі.

Адпаведны рэстаўрацыйны праект зацверджаны на рэалізацыю Міністэрствам культуры і атрымаў высокую ацэнку ў Ватыкане, дзе яго прадставілі сёстры-назарацянкі. Праект распрацаваны дзвюма выпускніцамі Беларускай акадэміі мастацтваў — Ганнай Радзюк і Наталляй Сталковіч. Абодва дызайнеры раней скончылі мастацка-рэстаўрацыйнае вучылішча ў Міры і даўно займаюцца тэмай Навагрудскага касцёла, паведамляе епархія.

У адпаведнасці з канцэпцыяй акцэнт пры рэстаўрацыі будзе зроблены на тым, каб захаваць памяць аб разбураных у савецкія гады касцёлах і ўшанаваць памяць закатаваных гестапаўцамі ў 1943 годзе адзінаццаці манашак-назарацянак, прылічаных да ліку блажэнных. Новы від набудзе іх грабніца, з'явіцца надпіс на беларускай мове, а таксама надпіс з імёнамі манашак, схаваная за адмысловай канструкцыяй.

У адной з капліц, якая цяпер не выкарыстоўваецца, плануецца выставіць знойдзеныя мясцовымі жыхарамі дошкі з часцінкамі мошчаў святых, якія замуроўваліся ў сцены разбураных храмаў. Тут жа можна будзе ўбачыць аб'ёмныя вобразы страчаных культавых збудаванняў, што стане магчымым дзякуючы спецыяльнай падсветцы. Пачаць рэстаўрацыю плануецца ўжо гэтым летам, паведамілі ў епархіі.

БЕЛТА.

КУПЛЯЦЬ «З ЗЯМЛІ» НЕБЯСПЕЧНА

Гандаль прадуктамі харчавання ў несанкцыяніраваных месцах небяспечны, папярэджвае пакупнікоў Гродзенскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі і распачынае рэйды па яго спыненні.

Апошнім часам стыхійныя рынкі можна назваць у Гродне каля многіх гандлёвых пунктаў. Прычым самі ж пакупнікі і стымулююць сваімі грашыма абарот патэнцыяльна небяспечнай прадукцыі. Нягледзячы на тое, што набыццё прадуктаў непасрэдна з зямлі альбо з бруднай скрыні, без захавання неабходнага тэмпературнага рэжыму (і, акрамя таго, у людзей без медыцынскага агляду) пагражае харчовым атручэннем, вострымі кішэчнымі інфекцыямі, туберкулёзам і іншымі захворваннямі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

КОНКУРС У ЛІЦЭЙ БДУ — 5,6 ЧАЛАВЕКА НА МЕСЦА

У Ліцэі БДУ падвялі вынікі прыёмнай кампаніі. Усяго сёлета пра сваё жаданне стаць ліцэістам заявілі 1407 чалавек (летась было 1358 ахвотных), у тым ліку 35 пераможцаў рэспубліканскіх прадметных алімпіяд, якія залічваюцца без уступных іспытаў.

Найбольшая колькасць заяў паступіла ад школьнікаў, якія планавалі паступаць на фізіка-матэматычны профіль, — 635. На паступленне ў хіміка-біялагічныя класы пададзена 366 заяў, у філалагічныя — 277, а грамадазнаўчы кірунак зацікавіў 120 чалавек. Усяго ў Ліцэй было прынята 288 чалавек, з якіх будуць сфарміраваны 12 класаў па 24 чалавекі. Такім чынам, агульны конкурс у Ліцэй склаў 5,6 чалавека на месца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДЫМ ПАДАРАЖЭЕ

Максімальныя рознічныя цэны на асобныя віды цыгарэт з фільтрам у ліпені павялічацца ў Беларусі на 0,9-30%. Аб гэтым паведамляецца на сайце Міністэрства па падатках і зборах.

Гаворка ідзе ў асноўным пра цыгарэты, якія вырабляюцца на тэрыторыі Беларусі. Іх выпускаюць ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» і ТАА «Тытунь-інвест». Цэны на большасць імпартаваных марак цыгарэт у ліпені застануцца на ўзроўні чэрвеня.

Больш за ўсё ў ліпені падаражэюць цыгарэты Magna Red і Magna Blue — на Br1500 да Br6450 за пачак. Акрамя таго, будуць устаноўлены цэны на шэраг новых відаў цыгарэт такіх марак, як Winston, Pall Mall, «Фэст».

Сяргей КУРКАЧ.

МАШЫНУ, УКРАДЗЕНУЮ Ў ВІЦЕБСКУ, ЗНАЙШЛІ Ў РАСІІ

Міліцыянеры Віцебскай вобласці і паліцэйскія са Смаленскай вобласці Расіі па «гарачых слядах» раскрылі крадзеж аўтамашыны «Аўдзі», якую ўгналі ў Віцебску.

— Аўто ўкралі ў жыхаркі Віцебска, 1984 года нараджэння. Яна расказала ў міліцыі, што машына, 1993 года выпуску стаяла каля дома на праспекце Будаўнікоў. Высветлілася, што дзяўчына правяла вечар у кампаніі знаёмых. А на наступны дзень не знайшла не толькі ключы ад аўто, але і саму машыну, — паведамілі супрацоўнікі аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама. —- Аказалася, што трое маладых людзей знайшлі ключы ад аўтамашыны, якія выпалі з кішэні пацярпелай. Уначы яны перагналі «Аўдзі» ў горад Рудню Смаленскай вобласці. Там пакінулі машыну і вярнуліся назад.

Калі стала вядома аб начным ваяжы падазроных, інфармацыя аб крадзяжы транспартнага сродку была неадкладна перададзена расійскім калегам. І да аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў падключыліся супрацоўнікі крымінальнага вышуку Руднянскага аддзела ўнутраных спраў. Машыну знайшлі на адной з вулачак расійскага горада. Асобы ўсіх падазроных ва ўгоне ўстаноўлены. Адзін з іх, жыхар Віцебска, затрыманы. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ШТУРМ НАРКАПРЫТОНА З НЯБЁС

Міліцыі стала вядома, што насельнікі кватэры на пятым паверсе дзевяціпавярховіка ў Гомелі займаюцца вырабам наркотыкаў.

Падчас працэсу грамадзяне заўсёды былі максімальна асцярожнымі і блакіравалі металічныя дзверы. Менавіта таму аперацыю па ліквідацыі гэтага наркапрытона праваахоўнікі рыхтавалі асабліва старанна. Дзеянні ўсіх удзельнікаў аперацыі разлічваліся з матэматычнай дакладнасцю. Для сілавой падтрымкі была выклікана група супрацоўнікаў АМАПа, якія валодаюць навыкамі альпінісцкай падрыхтоўкі і штурму будынкаў. У момант, калі пачаўся выраб з насення маку наркотыкаў, у адчыненыя вокны пятага паверха, нібы з нябёс, уварваліся АМАПаўцы, забяспечыўшы ўваход аператыўнікаў. Уся аперацыя заняла некалькі хвілін. Як паведаміў начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Гомельскага аблвыканкама Юрый Маркевіч, сёлета толькі ў Гомелі выяўлена 145 злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў, у тым ліку 53 факты іх збыту.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

МАЛАНКА ПАДПАЛІЛА ГАЗ

У Смалявіцкім раёне паблізу вёскі Пекалін з-за навальнічнага разраду загарэўся газ у зоне выкіду магістральнага газаправода.

— Пра здарэнне стала вядома ў 20.25. На месцы нашы работнікі ўбачылі адкрытае гарэнне паверх дзвюх скідавых свечак трубаправода. Вышыня полымя была каля 40 сантыметраў. Дыяметр свечак складаў 400 міліметраў. Загаранне адбылося на вышыні 6 метраў магістральнага трубаправода ў раёне кранавай пляцоўкі. Брыгада «Мінгаза» пацвердзіла, што адбываецца ўцечка і гарэнне газу, — паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях. — Бліжэй да апоўначы пры дапамозе стацыянарнага лафетнага ствала ад аўтацыстэрны МНС полымя было збіта. Потым краны былі загерметызаваныя. Падача газу спажыўцам не спынялася. Зніжэння ціску ў магістральным трубаправодзе не было. Мяркуецца, што прычынай загарання газу стаў навальнічны разрад маланкі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДОБРЫ ФЕЛЬЧАР БРАЛА ХАБАР,

а генеральны дырэктар «махляваў» з камандзіровачнымі.

Пракурорам Лепельскага раёна заведзена крымінальная справа ў дачыненні да жанчыны, якая, працуючы на пасадзе фельчара амбулаторыі ўрача агульнай практыкі № 1 Лепельскай цэнтральнай раённай бальніцы, брала хабар.

Паводле інфармацыі пракуратуры Віцебскай вобласці, мінулай восенню на працягу прыкладна месяца гэты медык атрымала загадзя абумоўленае ўзнагароджанне ад трох грамадзян. Апошнія грашыма дзякавалі за спрыяльнае вырашэнне пытанняў, звязаных з выдачай фіктыўных лісткоў непрацаздольнасці. Усяго такім чынам фельчар зарабіла 445 тысяч рублёў. А пракурорам Аршанскага раёна заведзена крымінальная справа ў дачыненні да мужчыны, які, працуючы генеральным дырэктарам таварыства «Аршанскі райаграсэрвіс», сумесна з кіроўцам гэтага ж прадпрыемства незаконна атрымаў камандзіровачныя на агульную суму больш за 2,1 мільёна рублёў — у выніку ўнясення фальшывых звестак у камандзіровачныя пасведчанні.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Медыяперсона

Дзіяна РЭВЯКОВА:

«НЕ КОЖНЫ, ХТО МАРЫЦЬ ПРА ТЭЛЕБАЧАННЕ, ВЫТРЫМЛІВАЕ ВЫПРАБАВАННЕ РЭАЛЬНАСЦЮ»

Праца на тэлебачанні падаецца прывабнай ідэяй, калі ты сядзіш на канапе і пераключаеш каналы. Аднак, збіраючыся патрапіць на экран, насамрэч варта рыхтавацца да сур'ёзных выпрабаванняў. Дзіяна Рэвякова сустракаецца з гледачамі ў рубрыках «У курсе» і «Нявынікі» на тэлеканале «Беларусь-1». Сакрэтамі пра тое, як спыняецца час у эфіры, наколькі выгадна быць бландзінкай, а таксама пра закадравае жыццё людзей з «блакітнага экрана» яна падзялілася з намі.

— Вы ведалі, якія цяжкасці чакаюць, калі ішлі спрабаваць сябе на тэлебачанні?

— Як аказалася, я нават блізка не мела ўяўлення пра тое, што значыць працаваць на тэлебачанні. Многім гледачам здаецца, што быць вядучым вельмі проста: прачытаў тэкст на камеру — і ўсё. І пакуль не апынешся на гэтым месцы, думаецца, што работа лёгкая. Але нават пасядзець у грымёрцы дзве гадзіны пасля падрыхтоўкі тэксту да эфіру складана. Мне здаецца, што на тэлебачанне трапляюць тыя, хто вельмі моцна хоча там працаваць. Я даволі часта размаўляю з дзяўчатамі, якія мараць пра тэлебачанне, і разумею, што ніхто не думае пра зваротны бок працы. Яны быццам бы згодныя ахвяраваць усім: і асабістым жыццём, і вольным часам. А на справе не кожны вытрымлівае выпрабаванне рэальнасцю.

— У прамы эфір таксама не адразу трапляеш?

— Як правіла, новыя людзі праходзяць кастынг. І нейкі час ты павінен папрацаваць пазаштатна, каб да цябе прыгледзеліся. Потым, маючы ўжо нейкі вопыт, можна падысці да кіраўніка і папрасіць цябе «паглядзець». На працу бяруць перш за ўсё людзей, якім цікавы сам працэс.

— Якія адчуванні даюць некалькі хвілін эфіру?

— Тут зусім іншае ўспрыманне часу. Да прыкладу, калі вы глядзіце навіны і пасля агучанай вядучым інфармацыі ідзе інтэрв'ю з некім, звычайна яго працягласць усяго 20 секунд. Калі я толькі пачынала працаваць, часта думала: «Што можна паспець сказаць за такі кароткі час?». Але тэлевізіёншчыкам нават некалькі хвілін часам здаюцца вечнасцю. Ад калег можна пачуць: «Нават калі проста замаўчаў і зрабіў удых, то паспеў дзясятак думак адагнаць, а глядач падумае, быццам вядучы проста пераклаў паперку».

— Раскажыце аб працоўнай атмасферы ў вашай камандзе?

— Каманда, у якой я працую, — гэта Агенцтва тэленавін. Там падтрымліваюць творчасць у любых праявах. Кім бы ты ні працаваў: вядучым, рэдактарам, рэжысёрам — калі раптам у цябе ўзнікла добрая ідэя, якая, на твой погляд, можа быць цікавай гледачу, то заўсёды можна падысці да свайго кіраўніка і падзяліцца сваім бачаннем яе ўвасаблення ў жыццё. Табе нават дапамогуць яе дапрацаваць. А там, хто ведае, магчыма, нават станеш новым вядучым у эфіры. Аднак, калі што, ніхто не будзе з табой нянчыцца. І не з-за таго, быццам да цябе нікому няма справы, а таму што з цябе хочуць зрабіць прафесіянала.

— На экране вы расказваеце пра навіны эканомікі. А ў жыцці гэты досвед дапамагае?

— Я да грошай стаўлюся хоць і паважліва, але вельмі проста. Не магу сказаць, што ў нечым сабе адмаўляю. Нават адкладваю зберажэнні. Калі трэба нешта набыць, то кіруюся толькі адчуваннем «падабаецца» ці «не падабаецца». Варта лёгка развітацца з грашыма, тады яны абавязкова вернуцца.

— Часта даводзіцца даказваць, што бландзінка можа быць разумнай і цікавіцца сур'ёзнымі рэчамі?

— Калі ты бландзінка, то цябе часцей за ўсё ўспрымаюць стэрэатыпна. Але разумная дзяўчына ўмее такім становішчам карыстацца. Адзін калега нават падзяліўся сакрэтам: калі робіш выгляд, быццам не вельмі добра разбіраешся ў нечым, то табе імкнуцца падрабязна ўсё патлумачыць, і ў выніку атрымліваецца добры матэрыял.

— Чым даводзіцца ахвяраваць на карысць працы?

— Практычна на ўсё, акрамя працы, застаецца мала часу. У нас ненармаваны працоўны дзень. Калі, напрыклад, ідзеш на працу і ведаеш, што сёння будуць здымкі сюжэта, то трэба разумець: выезд на месца можа быць і пасля абеду. А потым вернешся і да вечара будзеш працаваць над яго падрыхтоўкай да эфіру. Таму, можна сказаць, я забылася, як гэта можна дамовіцца пайсці з кімсьці ў кіно, тэатр ці на канцэрт. У апошні момант усе планы могуць адмяніцца. Людзі часта не разумеюць цябе, таму што лічыцца: калі ёсць жаданне, то і час знойдзеш. Аднак гэта не пра нас.

— Але пераменамі ў сваім жыцці вы задаволены?

— Я па жыцці іду ад адной мэты да другой. Калі ты вырашаеш, што хочаш нечага дасягнуць, то абавязкова зможаш зрабіць гэта. І, здзейсніўшы задуманае, адчуваеш нешта неверагоднае. А задумваючыся, як і што магло б быць, разумееш: нічога нельга пралічыць, трэба проста дзейнічаць.

Алена ДРАПКО

■ Медыяпрастора

МИР

Брэст	106.6 FM
Віцебск	101.8 FM
Мінск	107.1 FM
Гродна	104.2 FM
Магілёў	107.8 FM
Бабруйск	103.6 FM
Баранавічы	98.4 FM
Салігорск	104.3 FM
Пінск	103.2 FM

«МАДАМ»

Калі кажуць аб бракафобах, звычайна маюць на ўвазе мужчын, якія не хочуць ажаніцца. Аднак ёсць і жанчыны, якія баяцца выходзіць замуж. Звычайна гэта адбываецца неўсвядомлена: жанчына лічыць, што ёй проста не шанцуе з кандыдатамі на руку і сэрца, а на самой справе падсвядома робіць усё, каб адносіны не зайшлі занадта далёка. Што прыводзіць да боязі выходзіць замуж? Прычын шмат.

20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.40 Камедыя «На спіне ў чорнага ката».
23.00 «Ежа багоў».
0.00 Еўрапейскі покерны турнір.
0.50 Маст. фільм «Зграя».

МІР

5.00 Серыял «Агонь кахання».
6.40 Серыял «Арабела вяртаецца».
7.05 «Цік-так».
7.20 Маст. фільм «Дванаццатае лета».
9.00, 12.00, 15.00, 18.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10, 23.05 Маст. фільм «Дадатковы прыбывае на другі пуць».
11.30 «Партызанскі край».
12.25, 2.00 Маст. фільм «Крыніца».
14.15 «Рэспубліка сёння».
14.30, 1.35 «Сардэчна запрашаем».
15.25 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
17.00 Сакрэтныя матэрыялы.
17.30 «Злачынства і пакаранне».
18.30 «Акцэнты».
18.45 Маст. фільм «Уваход праз акно».
21.00 Канцэрт «Квітней, мая Беларусь».
3.20 Маст. фільм «Цырк».

8 КАНАЛ

7.00, 12.15, 18.40, 21.05, 0.00 «Надвор'е».
7.05 М/с «Ліга справядлівасці».
7.25, 14.35 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».
9.05, 17.50 Серыял «Дзённікі вампіра».
9.50 «Мой любімы гадавянец».
10.20, 18.45 Серыял «Праслушка».
12.20 Баявік «Від на забойства».
16.15 Мультпарад.
16.30 «Адшукваецца адпачынак».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.40 Камедыя «На спіне ў чорнага ката».
23.00 «Ежа багоў».
0.00 Еўрапейскі покерны турнір.
0.50 Маст. фільм «Зграя».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00, 14.00, 18.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30, 17.30 «С.У.П.».
9.00 Серыял «Татавы дочкі. Нявесты».
10.00, 19.00 Серыял «Амазонкі».
11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».
12.00 Серыял «Дзетка».
13.00, 16.30, 0.00 Скетч-шоу «Анекдоты».
13.30, 17.00, 20.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
14.30, 23.30 «Улётнае відэа».
15.00 Серыял «Кадэцтва».
16.00, 18.30, 0.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
21.10 Серыял «Галыгін. ru».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Асаблівы выпадак».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Прамы эфір».
12.40 Серыял «Раскол».
13.50, 16.50, 19.50, 23.40 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «1000 дробязяў».
15.10 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.55 Серыял «Самара».
17.15 Мясцовы час. Весткі—Масква.
17.30 Весткі. Дзяжурная часць.
17.50 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».
18.50 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».
20.45 «Юрмала».
22.40 Серыял «Земскі доктар. Працяг».
23.50 Серыял «Пацалуйце нявесту!».
0.45 Маст. фільм «Прымета на шчасце».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05 Сёння.
10.55 «Да суда».
11.55 «Суд прысяжных».
13.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
15.10 «Справа густу».
15.35, 18.35 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
16.25 «Пракурорская праверка».
19.35 Серыял «Кодэкс гонару».
23.05 «Кодэкс гонару. Мужчынская гісторыя».
23.55 «Ты не паверыш!».
0.45 «Першая кроў».

ІНТЭР+

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00 Навіны.
7.10, 7.35, 8.10, 8.35 Раніца з ІНТЭРам.
9.10, 2.00, 4.00 Феерыя падарожжаў.
9.30 Серыял «Людзі і цені-1».
10.25, 17.35 Дак. серыял «Галівудскія пары».
11.15 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
12.20 Рэчавы доказ.
13.05, 18.25, 5.10 Серыял «Анёл-ахоўнік».
13.50, 0.40 Маст. фільм «Без сына не прыходзь».
15.15 Пазавочы. Уладзімір Гаранскі.
16.00 Серыял «Вяроўка з пяску».
16.50, 4.25 Сямейны суд.
19.15, 2.15 Дак. серыял «Украіна. Забытая гісторыя».
20.00, 3.00 Падрабязнасці.
20.30 Шустар Live.
3.30 Смартшоу.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Чалавек і закон». 1991 год.
6.00 «Спявае ВІА «Сіняя птица». 1979 год.
6.25 «Сядзі і глядзі». 1994 год.
6.40, 12.40 «Арбацкі матыў». Маст. фільм.
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Час».
9.00, 15.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00 «Алё, мы шукаем таленты!». 1970 год.
11.00 «Паглядзі ў вочы мне...». Памяці В.М. Шукшына. 1989 год.
12.00 «Ранішняя пошта». 1986 год.
16.00 «Тэма». 1994 год.
17.00 «Інстытут чалавека. Пра забароненае». 1990 год.
18.00 «Будзільнік» 1981 год.
18.40 «Алі-Баба і сорак разбойнікаў». Фільм-спектакль.
21.00 «Колба часу».
22.00 «Кінапанарама». 1990 год.
23.00 «Гэта была хвароба...». Дак. фільм.
0.00 «Сольны канцэрт Глорыі Гейнер». 1979 год.
0.40 «Зайздрасць», 2 частка. Фільм-спектакль.
1.40 «Ракавое каханне». М/ф.
4.00 «Прывітанне свет, прывітанне сябар!». 1986 год.

EUROSPORT

9.30 Відэачасопіс.
9.45, 13.45, 15.00, 0.15 Веласпорт. Тур дэ Франс.
10.45, 11.45, 12.45, 18.45 Футбол. Чэмпіянат свету U-20.
19.30, 2.00 Еўраспорт. Топ-10.
20.00 Самыя дужыя людзі планеты.
21.00 Бокс. Bigger's Better.
0.00 Коннаспартыўны часопіс.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 5.45, 8.00, 12.55, 12.30, 16.25, 2.25, 2.55 Серыял «Мая сям'я».
6.15 Камедыя «Вяртанне высокага бландзіна».
7.40, 15.40, 23.55, 1.50 «Камедыянты».
8.30 Камедыя «Скарбонка».
11.15 Камедыя «Экстрэмальнае спатканне».
14.10 Камедыя «Сто мільёнаў ёўра».
17.20 Камедыя «Яе па-ранейшаму праследуе нягоднік».
18.35 Камедыя «Шукальнік прыгод».
19.20 Камедыя «Любовь-морковь».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

2.00, 8.00, 14.00 Фільм-казка «Прыгоды ў горадзе, якога няма».
3.25, 9.25, 15.25 М/с «Трое жабянят». М/ф: «Хто атрымае ананас», «Мышаня і чырвонае сонейка».
4.00, 10.00, 16.00 М/с «Вялікая энцыклапедыя прыроды». Казкі: «Тайна запечнага цвыркуна», «Залатарогі алень».
5.00, 11.00, 17.00 Фільм-казка «Казка пра закаханага маляра». М/ф «Рабінзон і самалёт».
6.30, 12.30, 18.30 М/с «Легенда пра Зора».
7.00, 13.00, 19.00 «Урокі цётачкі Савы». М/ф: «Дзяўчынка і зайцы», «Упершыню на арэне».

ТБ3

6.00 М/ф.
8.00, 3.45 «Камісар Мегрэ». Серыял.
9.00, 18.30, 2.15 «Фатмагуль». Серыял.
10.45, 17.00 «Паралельны свет». Дак. серыял.
11.45, 16.00 «Варажбітка». Дак. серыял.
12.45, 18.00 «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
13.15 «Без права на памылку», заключная серыя. Серыял.
14.15 «Канцінуум». Серыял.
15.05, 1.30 «Менталіст». Серыял.
20.15, 4.30 «Эйс Вентура 2: Калі кліча прырода». Камедыя.
22.00 «Зламаныя кветкі». Маст. фільм.
0.00 «Каліфрэнія». Серыял.
0.30 «Быць чалавекам». Серыял.

ТБ1000

5.00 «Сёстры Магдаліны». Драма.
7.10 «Павуціна хлусні». Драма.
9.30 «Ключ ад усіх дзвярэй». Жахі.
11.30 «Ідэальны незнаёмец». Трылер.
13.45 «Шэры». Драма.
16.00 «Доказ жыцця». Баявік.
18.30 «Кірмаш пыхлівасці». Трагікамедыя.
21.00 «Воўк-адзіночка». Жахі.
22.50 «Цана страху». Трылер.
1.00 «Вайна светаў». Фантастыка.
3.05 «Званок». Жахі.

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 «Салдат і слон». Камедыя.
8.00 «Лапухі». Камедыя.
10.30 «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: Сабака Баскервіляў». Дэтэктыў.
14.00 «Мужчынская жаночая гульня». Камедыя.
16.00 «Ёлкі». Камедыя.
18.00 «Кватарантка». Меладрама.
20.00 «Стэп бай стэп». Камедыя.
22.00 «Ушчэнт». Камедыя.
23.50 «Мішэнь». Драма.
2.40 «Формула шчасця». Меладрама.
4.20 «Тры плюс два». Камедыя.

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Злавіць сома.
6.00, 10.00 Нашэсце чорных пацукоў.
7.00, 15.00 У пошуках акул.
8.00, 16.00 Паветраныя асы вайны.
9.00, 12.00, 17.00 Тайны гісторыі.
11.00, 19.00, 3.00 Турэмныя наглядчыцы.
13.00, 18.00, 2.00 Вайна генералаў.
14.00 Драпежнікі неба.
20.00, 23.00, 4.00 Дзікі тунец.
21.00, 0.00 Злавіць сома.
22.00, 1.00 Брытанскія НЛА.

DISCOVERY

7.00, 16.25 Рэальныя дальнабойшчыкі.
7.50, 12.20, 3.05 Цуды, створаныя рукамі.
8.40, 20.05 Патрабуецца зборка.
9.10, 20.35, 4.45 Як працуюць машыны.
9.35, 15.30, 5.10 Экстрэмальная рыбалка.
10.30, 11.00, 2.15, 2.40 Справа тэхнікі!
11.25, 17.20, 3.55 Разбуральнікі легенд.
13.15, 0.00 Top Gear.
14.10, 6.05 Вялікі махінатар.
15.05 Махінатарыі.
18.15, 18.45 Круцей не прыдумаеш.
19.10, 19.40 Дзіўныя сувязі.
21.00 Самагоншчыкі.
22.00 Вершнікі пекла.
23.00 Імперыя па-за законам.
0.55 Монстры ўнутры мяне.
1.50 Маланкавыя катастрофы.

СУБОТА, 6 ЛІПЕНЯ

1 БЕЛАРУСЬ 1

5.40 Камедыя «Залатое цяля».

8.30 Існасць.
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10 Зямельнае пытанне.
9.35, 0.40 Серыял «Татулі».
10.45 Здароўе.
11.30 Усё як трэба!
12.10 Камедыя «Будзьце маім мужам».
14.05 Дак. серыял «Паміж мірам і вайной».
14.15 Вакол планеты.
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 «Усе песні для каханай». Канцэрт.
17.25 Каробка перадач.
18.00 Тайны следства.
18.35 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
19.15 Меладрама «Каханне з акцэнтам».
21.00 Панарама.
21.40 Камедыя «Пакуль ты спаў».
23.35 «Зорнае жыццё». «Самыя зайздросныя жаніхі і нявесты свету».
0.30 Дзень спорту.

2 БЕЛАРУСЬ 2

7.50 М/ф: «Стойкі алавяны салдацік», «Тайна далёкага вострава».
8.35 Фільм — дзецям. «Бронзавая птушка», 1-я і 2-я серыі.
10.45 Пазакласная гадзіна.
11.10, 20.50 Тэлебарометр.
11.15 Драма «Варашылаўскі стралок».
13.05 Тэніс. Уімблдон. Агляд.
14.05 Пад грыфам «Вядомыя».
14.40 Беларуская кухня.
15.15 Дак. серыял «Усе грані шаленства».
16.00 Тэніс. Уімблдон. Фінал.
18.25 Фактар сілы.
18.55 «Беларускі народны каляндар. Купалле». Дак. фільм.
19.15 Ваша лато.
20.00 Латарэя «Пяцёрачка».
20.10 Вышэй, чым дах.
20.55 Футбол. Чэмпіянат свету U-20. 1/4 фіналу. У перапынку: **21.35** «КЕНО».
22.55 Валейбол. Еўраліга. Беларусь — Ізраіль.

3 БЕЛАРУСЬ 3

8.00 «Таямніца душы».
8.30, 16.20 «Хто смяецца апошнім». Маст. фільм.
10.05, 17.55 «Запіскі юнага ўрача». Міхаіл Булгакаў.
11.15, 19.05 «Чужая бацькаўшчына». Кінааповесць.
12.40, 20.55 М/ф.
13.35, 22.50 «Паходня вайны».
14.30, 23.40 «Барвовая трава». Кароткаметражны фільм.
15.00, 21.25 Сольны канцэрт Ірыны Дарафеевай.
20.30 Калыханка.

АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
9.20 «Здароўе».
10.25 «Смак».
11.05 «Ідэальны рамонт».
12.05 «Ералаш».
12.20 «Спадчына». Серыял.
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 Камедыя «500 дзён лета».
18.15 «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
21.05 «Сёння ўвечары».
22.50 Маст. фільм «Храбрае сэрца».

СТБ

6.20 «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
8.00 Камедыя «На спіне ў чорнага ката».
9.40 «Чыстая праца».
10.30 «100 працэнтаў».
11.00 «Жанчыны XX стагоддзя» з Элеанорай Язерскай.
11.30 «Мінск і мінчане».
12.05 «Сакрэтныя тэрыторыі».
13.05 «Прыгоды дылетанта».
13.40 Маст. фільм «Пасля кірмашу».
15.00 «Ваенная тайна».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.40 «Такі лёс».
18.30 «Дзіўная справа».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 Міс Мінск 2013. Фінальнае шоу.
23.00 «Зорны рынг».
23.55 Маст. фільм «Кадэт».
1.30 «Глядзець усім!».

МІР

5.00 Дак. фільм «Галівудскія пары».
6.10 М/ф.
7.35 «Мільён пытанняў пра прыроду».
7.50 М/с «Смяшарыкі».
8.05 «Ведаем рускую».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 «Даведнік».
9.35 «Ежа з Зіміным».
10.05 «Нязоркавае дзяцінства».
10.30, 0.25 Маст. фільм «Вяртанне дадому».
13.35 Маст. фільм «Забаржад».
15.10 Ток-шоу «Яшчэ не разам».
15.50, 21.00 Серыял «Мая мяжа».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 «На шашлыкі».
9.40 «Зроблена ў СССР».
10.10, 0.05 Маст. фільм «Трыццаць першае чэрвеня».
12.40 Маст. фільм «Уваход праз акно».
15.10 Серыял «Амапола».
20.50 «Навіны Садружнасці (бягучы радок). Культура».
21.35 «Сусветная канапа. Казань. Універсіяда 2013».
22.05 Маст. фільм «З ног на галаву».
2.30 Маст. фільм «Музычная гісторыя».
4.00 «Цюркі Расіі».

8 КАНАЛ

9.00, 13.55, 18.55, 21.00, 23.45 «Надвор'е».
9.05 «На рыбалку».
9.20 Серыял «Праслушка».
11.20 «Даведнік па краінах і кантынентах».
11.30 Трылер «Праўдзівая хлусня».
14.00 Драма «На мяжы».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Серыял «Прыгоды Шырлі Холмс».
17.25 Серыял «Рыцар дарог».
19.00 Прыгоды «Бібліятэкар».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Драма «Маўчанне ягнят».
23.15 «Кінаблакнот».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.30 Серыял «Татавы дочкі».
9.30 «Бітва інтэр'еру».
10.30, 13.00, 0.00 «Улётнае відэа».
11.00 «Сукенка маёй мары».
11.30, 17.00, 23.20 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
12.00, 21.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
12.30, 17.30, 0.30 Скетч-шоу «Анекдоты».
13.30, 21.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 Серыял «Нанакаханне».
16.00 «Практычная магія».
18.00 «Нерэальная гісторыя».
20.00 «Уральскія пельмені».
22.10 «Кіно ў дэталях».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Юрмала».
8.25 Маст. фільм «Прымета на шчасце».
10.25 «Ранішняя@пошта».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.15 «Суботнік».
11.55 «Гарадок».
12.25 Маст. фільм «Аднойчы праз дваццаць гадоў».
14.15 «Хвілінная справа».
15.15 Маст. фільм «Багатая Маша», 1-я серыя.
17.05 «Суботні вечар».
19.00 «Карціна свету».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.40 Маст. фільм «Палёт матылька».
0.10 1/4 фіналу Першай лігі МС КВЗ.

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.30 Серыял «Злачынства будзе раскрыта».
8.00, 10.00, 13.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Іх норавы».
8.55 «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
10.50 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.20 «Прафесія — рэпарцёр».
13.50 «Следства вялі...».
14.40 «Вочная стаўка».
15.30 «Казнакрады».
16.20, 19.25 Серыял «Другі забойны».
23.50 Серыял «Дарожны патруль».

ІНТЭР+

6.00 Шустар Live.
9.25 Смартшоу.
9.55 Дак. серыял «Украіна. Забытая гісторыя».
10.35 Феерыя падарожжаў.
11.00 Маст. фільм «Без сына не прыходзь».
12.20 Маст. фільм «Акадэмія пана Кляксы».
14.55, 5.15 Маст. фільм «Жаніх і нявеста».
16.25, 23.25 Краіна смяецца.
16.40, 23.40 Вялікі канцэрт на Інтэры.
18.40, 1.40 Маст. фільм «Шуб Баба Люба».
20.00, 3.00 Падрабязнасці.
20.30, 3.30 Маст. фільм «Дэжа Вю».
22.15 Юбілейны канцэрт Міхаіла Жванецкага.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Паглядзі ў вочы мне...». Памяці В.М. Шукшына. 1989 год.
6.00 «Ранішняя пошта». 1986 год.
6.40, 0.40 «Арбацкі матыў». Маст. фільм.
8.00, 14.00, 2.00 «Час».
9.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00 «Тэма». 1994 год.
11.00 «Інстытут чалавека. Пра забароненае». 1990 год.
12.00 «Будзільнік». 1981 год.
12.40 «Алі-Баба і сорак разбойнікаў». Фільм-спектакль.
15.00 «Колба часу».
16.00 «Кінапанарама». 1990 год.
17.00 «Быў час». 2009 год.
18.00 «Цвецік-сяміцвецік». Кароткаметражны фільм.
18.40 «Любоў Арлова». 1969 год.
19.30 «Хіт-парад «Астанкіна». 1992 год.
21.00 «Задыяк». Маст. фільм.
22.10 «Белыя ночы». Канцэрт.
23.00 «Чалавек і закон». 1991 год.
0.00 «Спявае ВІА «Сіняя птица». 1979 год.
0.25 «Сядзі і глядзі». 1994 год.
4.00 «Алё, мы шукаем таленты!». 1970 год.

EUROSPORT

9.30, 13.45, 15.00, 1.00 Веласпорт. Тур дэ Франс.
10.45, 11.45, 12.45, 18.30, 20.00, 20.45, 2.00 Футбол. Чэмпіянат свету U-20.
23.00 Ралі-рэйд. Шаўковы шлях.
23.15 Коннаспартыўны часопіс.
23.30 Конны спорт. Global Champions Tour.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.20, 12.55, 21.00 Камедыя «Гвалтам завербаваны».
5.50, 13.35, 21.35 Камедыя «Граф».
6.15 Камедыя «Экстрэмальнае спатканне».
8.00, 16.00, 2.25 Камедыя «Крама ліхвяра».
8.30, 16.30, 2.50 Камедыя «Кантралёр універмага».
9.00 Камедыя «Сто мільёнаў ёўра».
10.40, 4.40 «Камедыянты».
11.15 Камедыя «Яе па-ранейшаму праследуе нягоднік».
12.25 Камедыя «За экранам».
14.10 Камедыя «Плюшавы сіндром».
17.15 Камедыя «Любовь-морковь».
18.40 «Любоў Арлова». 1969 год.
19.30 «Хіт-парад «Астанкіна». 1992 год.
21.00 «Задыяк». Маст. фільм.
22.10 «Белыя ночы». Канцэрт.
23.00 «Чалавек і закон». 1991 год.
0.00 «Спявае ВІА «Сіняя птица». 1979 год.
0.25 «Сядзі і глядзі». 1994 год.
4.00 «Алё, мы шукаем таленты!». 1970 год.

EUROSPORT

9.30, 13.45, 15.00, 1.00 Веласпорт. Тур дэ Франс.
10.45, 11.45, 12.45, 18.30, 20.00, 20.45, 2.00 Футбол. Чэмпіянат свету U-20.
23.00 Ралі-рэйд. Шаўковы шлях.
23.15 Коннаспартыўны часопіс.
23.30 Конны спорт. Global Champions Tour.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.20, 12.55, 21.00 Камедыя «Гвалтам завербаваны».
5.50, 13.35, 21.35 Камедыя «Граф».
6.15 Камедыя «Экстрэмальнае спатканне».
8.00, 16.00, 2.25 Камедыя «Крама ліхвяра».
8.30, 16.30, 2.50 Камедыя «Кантралёр універмага».
9.00 Камедыя «Сто мільёнаў ёўра».
10.40, 4.40 «Камедыянты».
11.15 Камедыя «Яе па-ранейшаму праследуе нягоднік».
12.25 Камедыя «За экранам».
14.10 Камедыя «Плюшавы сіндром».
17.15 Камедыя «Любовь-морковь».
19.20 Камедыя «Любовь-морковь 2».
22.10 Камедыя «Больш, чым сябар».
23.50 Камедыя «Скарбонка».
3.25 Камедыя «Вяртанне высокага бландзіна».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

2.00, 8.00, 14.00 Маст. фільм «Веснавая казка».
3.20, 9.20, 15.20 М/с «Трое жабянят». М/ф «Сабака ў ботах».
4.00, 10.00, 16.00 М/с «Вялікая энцыклапедыя прыроды». Казкі: «Цвецік-сяміцвецік», «Каша з сякеры».
5.00, 11.00, 17.00 Прыгоды «З коткі ўсё і пачалося...». М/ф: «Каляровае малако», «Хітрыя бабулькі».
6.30, 12.30, 18.30 М/с «Легенда пра Зора».
7.00, 13.00, 19.00 «Урокі цётачкі Савы». М/ф: «Капітошка», «Вяртайся, Капітошка».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.00, 5.30 «Сябры». Серыял.
9.30 «Уладар пярсцёнкаў: Дзве Крэпасці». Маст. фільм.
12.30, 4.00 «Сябар». Маст. фільм.
14.15, 2.20 «Вар'яты». Серыял.
16.10 «Сезон палявання». М/ф.
17.30 «Уладар пярсцёнкаў: Вяртанне Караля». Маст. фільм.

21.15 «Шык». Маст. фільм.
23.05 «Бунтуючае юнацтва». Маст. фільм.
0.45 «Каліфрэнія». Серыял.
1.15 «Быць чалавекам». Серыял.

ТБ1000

5.00 «Шэры». Драма.
6.40 «Цана страху». Трылер.
8.50 «Каханне, якое збівае з ног». Камедыя.
11.00 «Доказ жыцця». Баявік.
13.40 «Вайна светаў». Фантастыка.
16.00 «Кірмаш пыхлівасці». Трагікамедыя.
18.25 «Чалавек, якога не было». Драма.
20.30 «Званок». Жахі.
22.40 «Брацтва танца». Мюзікл.
0.50 «Слепата». Трылер.
3.10 «Сапраўдныя колеры». Драма.

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00, 1.30 «Сямейка Ады». Камедыя.
8.00, 21.50 «Тушыце свята!». Меладрама.
10.00, 23.30 «Ёлкі». Камедыя.
12.00 «Спартакіяда. Лакальнае пацяпленне». Камедыя.
14.00 «Мой хлопец — анёл». Фэнтэзі.
16.00 «Вой, мароз, мароз!». Камедыя.
18.00 «Іронія лёсу. Працяг». Меладрама.
20.00 «Ноч зачыненых дзвярэй». Камедыя.
3.40 «Навагодні раманс». Драма.

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 12.00 Золата горада-прывіда.
6.00 Звяры-тытаны.
7.00, 10.00, 15.00 У пошуках акул.
8.00 80-я: Найвялікшыя спартсмены.
9.00 З пункту гледжання навукі.
11.00 Шаша праз пекла.
13.00, 13.30 Рабі стаўкі і ўзрывай.
14.00 Місія па выратаванні тыграў.
16.00 Аўта-SOS.
17.00 Хрустальная пячора.
18.00 Замагільны свет Егіпта.
19.00, 23.00 Расследаванні авіякатастроф.
20.00, 0.00, 3.00 Ліхтугі за мяжой.
21.00, 0.10, 4.00 Секунды да катастрофы.
22.00, 2.00 Амерыканская калонія.

DISCOVERY

7.00, 17.20 Патрабуецца зборка.
7.25, 16.25 Круты цюнінг.
8.15 Рыбалка голымі рукамі.
9.10, 19.10 Ледзяное золата.
10.05, 10.30 Рыбацкія легенды.
11.00, 11.25, 23.00, 23.30, 6.05, 6.35 Адпетыя рыэлтары.
11.50, 12.20, 21.00, 21.30 Паляўнічыя на рэліквіі.
12.45, 13.15, 3.30, 3.55 Шалёная рыбалка.
13.40 Разбуральнікі легенд.
14.35 Мэта — Паўночны полюс.
15.30 Новае жыццё рэтраўтамабіляў.
17.50, 4.45 Як працуюць машыны.
18.15, 1.50 Самагоншчыкі.
20.05, 2.40 Аляска: апошняя мяжа.
22.00, 22.30, 5.10, 5.40 Паляўнічыя на склады.
0.00 Імперыя па-за законам.
0.55 Вершнікі пекла.
4.20 Маланкавыя катастрофы.

НЯДЗЕЛЯ, 7 ЛІПЕНЯ

1 БЕЛАРУСЬ 1

7.15 Камедыя «Будзьце маім мужам».
8.50 Слова Мітрапаліта Філарэта на Нараджэнне Іаана Прадцечы.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Арсенал.
9.35, 0.30 Серыял «Татулі», заключная серыя.
10.45 Урачэбныя тайны.
11.10 Зона Х.
11.45 Нашы.
12.10 Камедыя «Залатое цяля».
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 «Мая праўда». «Віктар Цой. Кумір пад абцасам».
16.30 Драма «Таварыства мёртвых паэтаў».
18.45 «Александрыя збірае сяброў». Свята «Купалле».
21.00 У цэнтры ўвагі.
21.55 Журналісцкае расследаванне.
22.30 Камедыя «Гульні джэнтльменаў».

2 БЕЛАРУСЬ 2

7.55 М/ф: «Малы і Карлсан», «Карлсан вярнуўся», «Пеця і Чырвоная Шапачка».
8.50 Фільм — дзецям. «Бронзавая птушка», заключная серыя.
9.55 Пазакласная гадзіна.
10.15 Камедыя «Купальская ноч».
11.35 Тэлебарометр.
11.40 Пра мастацтва.
12.10 Тэніс. Уімблдон. Агляд.
13.05 Містыка «Вій».
14.40 Камедыя «У павуцінні страху».
16.55 Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь. «Дынама» (Мінск) — «Шахцёр».
19.15 Суперлато.
20.20 Навіны надвор'я.
20.55 Чэмпіянат свету U-20. 1/4 фіналу. У перапынку: **21.35** «Спортлато 5 з 36», «КЕНО».
22.55 Валейбол. Еўраліга. Беларусь — Харватыя.
0.40 Спорт-кадр.

3 БЕЛАРУСЬ 3

8.00 «Дабравест».
8.30 «Музей Янкі Купалы». Дак. фільм.
8.50, 17.05 «Зацішша». Маст. фільм.
11.00, 19.15 «Блакітны карбункул». Дэтэктыў.
12.15, 21.05 М/ф.
12.35 «Мой пачатак». Марк Шагал. Тэлеспектакль.
13.00 «Наперад у мінулае».
13.35, 23.35 «Адвечная песня». Янка

Вялікая Еўрапейская

Малюнкі Юрыя Клявяда ў экспазіцыі на званіцы капліцы ў Заброддзі.

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

У гэтым месцы не адразу бачыш вайну. Духмяныя палі, клапатліва абкошаныя гаспадаром. Прычым і касьба ў яго мастацкая: Барыс Барысавіч пакідае астраўкі кветак, мінае асаблівыя расліны. Тут жа наводзяць парадкі жонка Цітовіча Валянціна Пятроўна, а таксама падлеткі з дзіцячага цэнтра «Надзея», будынак якога ўзведзены на Вілейскім вадасховішчы пры ўдзеле нямецкага дабрачыннага фонду. «Дзякуй Богу, — зноў кажа Цітовіч, — дзеткі корпаюцца. Не толькі ў сваім віртуальным асяроддзі за камп'ютарам, але і тут, у жывой дзейнасці, на прыродзе».

З адваротнага боку каплічкі бачым памятны камень, на якім напісана: «Памяні, Божа, душы ўсіх палеглых у гады Першай і Другой сусветных войн (1914—1918, 1939—1945)». Цітовіч тлумачыць, што раней гэта тэрыторыя была пад Польшчай і многія юнакі служылі тэрміновую службу ў польскім войску, а ў 1939 годзе, калі немец прыйшоў у Польшчу, трапілі на вайну. Таму, калі б напісаць на камені 1941, а не 1939, яны б засталіся быццам па-за межамі ваеннай гісторыі.

Цітовіч падкрэслівае, што абедзве вайны ўзаемазвязаны:

— Тыя, хто ваяваў у гады Вялікай Айчыннай, — гэта дзеці тых, хто годна змагаўся за Радзіму ў гады Першай сусветнай. Але ж атрымліваецца так, што мы ўшаноўваем тых, хто загінуў у Вялікую Айчынную, а іх бацькі — быццам і не пры чым. Сам я з 1948 года, мае дзяды і стрыечныя дзяды — усе ваявалі ў Першую сусветную. А бацька ў Вялікую Айчынную пайшоў кадравым афіцэрам і памёр у чыне палкоўніка пасля вайны, у 1963 годзе... А вёска Заброддзе — з 14 хат: трое чалавек удзельнічала ў Першай сусветнай вайне, адзін — у руска-японскай і 12 — у Вялікай Айчыннай. З іх 9 загінулі, а 3 вярнуліся інвалідамі.

Барыс Цітовіч пераехаў з Мінска жыць у Заброддзе ў 1974 годзе. Праз год выпадкова знайшоў паблізу ў лесе закінуты могільнік, на якім выразна праглядаліся 99 магіл... Аднак 20 гадоў не ўдавалася высветліць, чые ж гэта пахаванні: «архівы ўпарта маўчалі». Толькі пасля развалу Савецкага Саюза дзякуючы архіўным запытам за грошы ўдалося даведацца, што гэта магілы воінаў, якія памерлі ў шпіталі №1 29-й пяхотнай дывізіі 2-й рускай арміі 20-га армейскага корпуса.

Пазней высветлілася, што забродскія жанчыны, аказваецца, працавалі ў гэтым шпіталі медсёстрамі і называлі яго «абоз». У музеі, якія размяшчаецца ў капліцы Барыса і Глеба, нават ёсць фотаздымак, на якім мясцовыя жанчыны стаяць каля «абоза» разам з вайскоўцамі. Калі Барыс Цітовіч прыехаў у Заброддзе, тут яшчэ жылі два ўдзельнікі Першай сусветнай. Аднак па маладых гадах хіба здагадаешся распытаць дзядоў, як яны жылі, праз што прайшлі?...

Барыс Цітовіч упэўнены, што Беларусь была тым даволі моцным заслонам падчас Першай сусветнай вайны, дзякуючы якому ні кайзераўскія, ні аўстрыйскія войскі не змаглі не толькі выйсці на маскоўскі напрамак, але і не ўзялі ні Маладзечна, ні Мінск. За ўсю вайну адбыўся ўсяго адзін прарыў — са Свянцян: па Вілейскім раёне немцы выйшлі на барысаўскі напрамак. Амаль 3 гады стаяў фронт, і ворагі ніяк не маглі прайсці ў глыб Расійскай Імперыі.

Варта прыгадаць і сумна вядомую Нарачанскую аперацыю:

— За 10 дзён загінула 78 тысяч чалавек імператарскай арміі, — кажа Цітовіч, — і каля 30-40 тысяч немцаў. Галоўнае, што гэтая аперацыя адцягнула ўвагу ад Парыжа. Таму што немцы тады ўжо атакавалі парыжан. Францыя звярнулася да імператара: «Пачніце нейкія дзеянні». І сюды былі адцягнуты дывізіі з французскага фронту. Адзін з французскіх генералаў тады сказаў, што калі б не баі на нарачанскіх азёрах, то і сёння нямецкія і аўстрыйскія гарнізоны былі б у Францыі. А што з пахаваннямі на Нарачы? ...Там, дзе былі магілы, дзесьці бульбу пасадзілі, збожжа пасеялі, нейдзе зруйнавалі.

Яшчэ адзін жудасны факт той вайны — выкарыстанне газавай зброі. Першымі яе прымянілі немцы пад горадам Іпрам у Бельгіі. Пасля яе сталі выкарыстоўваць і войскі іншых краін, уключаючы Расію, у тым ліку на беларускай тэрыторыі.

Было дзве сістэмы вядзення такой вайны. Першая — гэта «газабалонная» атака, калі балоны выкладаліся на брустверы на працягу аднаго ці нават трох кіламетраў. Немцы ззаду, злева і справа рабілі завесу з дыму, адзявалі маскі і ішлі ў атаку...

Зразумела, у нас існавалі сродкі аховы дыхальных органаў на выпадак такой атакі, аднак з імі былі вялікія праблемы. Пад Баранавічамі выкарыстоўвалі павязкі ад хлору (Барыс Цітовіч расказвае, дэманструючы некаторыя прадметы ў забродскім музеі ў капліцы). Разам з імі даваліся дзве невялікія бутэлечкі са спецыяльнай вадкасцю (ёй трэба было змачыць маску і толькі пасля завязаць)... Быў і ка з актываваным вугалем. Яна магла выкарыстоўвацца не адну газавую атаку.

Фронт ішоў менавіта па нашай тэрыторыі, таму трэба проста музеефікаваць рэшткі Першай сусветнай вайны.

Цітовіч прыгадаў, што Смаргонь знаходзіцца на першым месцы ў рэспубліцы па колькасці дзяцей, хворых на цэрэбральны параліч, хоць і не надта папала пад уздзеянне чарнобыльскай аварыі, — ці не з'яўляецца гэта адгалоскам газавых атак, якія прымянялі тут абодва варагуючыя бакі?..

Падчас Першай сусветнай вайны ўпершыню з'явілася і авіяцыя. Аднак самалёты тады называлі апаратамі, бо яны ўяўлялі сабой каркас з механізмам, пакрыты фанерай. Сярэдняя працягласць жыцця лётчыкаў была ўсяго 3 тыдні.

1-ы карпусны авіяцыйны атрад дыслацыраваўся ў Вілейцы ў верасні 1916 года. Француз Альфонс Пуарэ, адзначыў Цітовіч, лятаў якраз над Заброддзем. А мясцовы выпускнік духоўнай семінарыі Авенір Касценьчык аказаўся адным з нямногіх шчасліўчыкаў. У вайну ён быў лётчыкам-асам, а пасля яе завяршэння яшчэ шмат гадоў працаваў панамаром.

Калі ж казаць пра агульныя звесткі, то кожны сёмы беларус загінуў у гады Першай сусветнай вайны. Усяго ў краіне тады было 7,5 мільёна чалавек. Прызыў у войска складаў амаль 900 тысяч. Разам вайскоўцаў і мірных жыхароў загінула каля 1 мільёна. Цітовіч дадаў:

— Некаторыя кажуць: «Гэта руская вайна, мы не маем ніякага дачынення». Але чаму не маем, калі, па-першае, столькі нашых загінула, па-другое, тады гэта была імперыя, у якую ўваходзілі беларускія землі. Таму, калі гаворыцца «расійская імператарская армія», — гэта не значыць, што ў ёй былі толькі рускія. Гэта было шматнацыянальнае войска, у якім ваявалі і беларусы, і ўкраінцы, і татары, і казахі...

Могілкі на месцы Рускасельскай царквы.

Ранейшая ўлада лічыла: «Царскі салдат — не наш салдат», — таму многае забылася і не захавалася. Аднак тая вайна мела жудасныя маштабы. Цітовіч расказвае:

— Спачатку называлася лічба ў 33 краіны, якія ваявалі ў Першую сусветную вайну. Пасля казалі 35, а зараз ужо 37 краін, што бралі ўдзел. Тая вайна называлася Вялікая Еўрапейская. Называлі яе і Імперыялістычнай, таму што Расійская, Асманская, Аўстра-Венгерская — усе гэтыя імперыі ўдзельнічалі і пасля разваліліся. Звалі яе і Другая Айчынная — другая пасля вайны з Напалеонам... Распад рускага войска ў гэтай вайне распачала Лютаўская рэвалюцыя. Урад Керанскага выдаў загад пад №1, які дазваляў салдату не падпарадкоўвацца афіцэру. Якое войска можа быць без субардынацыі?.. Усё пайшло ў развал. Дагэтуль немцы не тое што не маглі на Маскву выйсці — ім не ўдавалася ні Мінск, ні Маладзечна ўзяць. А як толькі Брэст-Літоўскае мірнае пагадненне падпісалі, Мінск занялі, дзве трэція ад агульнай тэрыторыі Беларусі таксама, у Пскоў прыехала рота веласіпедыстаў і без адзінага стрэлу захапіла. А людзям паабяцалі, што зямлю аддадуць дзецям у спадчыну. Аднак дзе тая зямля?..

Што ж адбываецца, калі змаўкаюць сведкі падзей, калі нашчадкі пагублялі запісы і пазнакі мінуўшчыны? Тады вышэйшая сіла нагадвае пра тое, што забываць нельга. Яшчэ адзін віляйчанін — Юрый Клявяда —з'яўляўся пацыентам неўралагічнага аддзялення Вілейскай бальніцы. Аднойчы Цітовічу патэлефанаваў яго лечачы ўрач і расказаў: «Ёсць у мяне адзін пацыент. Ляжыць на левым баку і ўсё малюе — здаецца, па Першай сусветнай». Аказалася, гэта сапраўды малюнкі салдат розных краін, што змагаліся ў той час, — і ўсе ў нацыянальнай, гістарычна дакладнай вайсковай форме: асманец, турак, шатландзец, француз, рускі і многія іншыя.

Розумам растлумачыць гэта немагчыма — усё адбываецца на пэўным генным узроўні. У навуцы такая з'ява мае назву «антыномія». А Барыс Цітовіч тлумачыць гэта так:

— Часта Гасподзь праз некага перадае пэўныя думкі, адкрыцці. Я гэта ўспрымаю так: забыліся мы на ўсё. А праз гэтага хворага чалавека нам робіцца напамін. Я дзецям часта паказваю гэтыя малюнкі і кажу: «Дзеткі, часта ў нас і ручкі, і ножкі, і галава ёсць, і папа, і мама, і харчы, і хатка, і машына. А лянота так заціскае, што і варухнуцца не хочам...» А наконт дару звыш, я вам скажу, што няма неталенавітага чалавека. І задача жыцця на зямлі — знайсці зерне свайго таленту. Яно ёсць. Што можа перашкаджаць? Першае — гэта лянота. Другое — тыя, хто знаходзяцца побач. Калі вакол таксама лянівыя ўсе, а бацька на стакане сядзіць, то і дзіця ўжо не можа сябе праявіць. Патрэбен хоць нейкі штуршок... Я вучыўся на мастака і скажу вам, што, каб намаляваць, напрыклад, казачага афіцэра, трэба паглядзець, якія рамяні, дзе компас, дзе кабура, колькі гузікаў, якой формы, які манжэт у яго. Гэта даволі вялікая праца. А на малюнках, якія зрабіў Юрый Клявяда, усё адпавядае рэчаіснасці.

Барыс Цітовіч сабраў гэтыя малюнкі, што ўжо паспелі разысціся па бальніцы, зрабіў дакладныя копіі (адзін у адзін) і размясціў на званіцы, што таксама пабудавана ў Заброддзі. Мяркуецца зрабіць камплект паштовак з гэтымі выявамі, а грашыма, якія будуць выручаны ад продажу, дапамагчы хвораму.

Ёсць і яшчэ адна задума, як увекавечыць памяць герояў Першай сусветнай вайны, — на вілейскіх гарадскіх могілках на ўваходзе паставіць браму-капліцу. Могільнік узнік там менавіта ў Першую сусветную вайну: там былі пахаваны воіны, якія ўдзельнічалі ў баях восенню 1915 года, — усяго 300 магіл. Аднак сёння нічога нават не нагадвае пра гэта. Бо спачатку побач з'явілася грамадзянскае пахаванне. А з цягам часу на вайсковых магілах сталі зверху хаваць савецкіх грамадзян. Атрымалася, што ваенныя пахаванні зруйнаваліся.

Калі заходзіш на могілкі, злева бачыш помнік загінулым у Вялікую Айчынную вайну. Тое, што зверху ляжаць дзеці, а знізу бацькі пахаваны, — гэта нармальна, па-хрысціянску, мяркуе Цітовіч. Аднак праблема ў тым, што няма нават маленечкай мясцінкі, каб крыж паставіць на ўспамін Першай сусветнай. Таму і з'явілася такая прапанова — зрабіць браму-капліцу. Яе дэталёвы праект ужо цалкам распрацаваны, прычым добраахвотна. Вілейскі выканкам даволі актыўна збірае грошы на яе будаўніцтва. Аднак, каб завяршыць справу, трэба, каб і будаўнікі праніклі нашай ідэяй, думае мастак. Таму стаіць задача знайсці людзей, якія зразумеюць справу і будаваць стануць таксама бясплатна.

Дарэчы, з 300 пахаванняў часоў Першай сусветнай, якія ёсць на гэтых могілках, вызначаны прозвішчы 250 — і гэта даволі шмат.

Але ў самім Заброддзі таксама ёсць праблемы. Барыс Цітовіч расказаў, што на месцы музейнага комплексу некалі было поле аж да ракі Нарачанкі, якое заворваў мясцовы калгас. Зямлю сапсавалі хіміяй так, што, калі яны з жонкай загарадзілі плот, гадоў 6 нічога не расло. Але потым пайшла прыродная самарэанімацыя: сталі з'яўляцца кветкі — белыя, жоўтыя, фіялетава-чырвоныя. Цяпер і вужы жывуць тут. Яны часам выпаўзаюць па штук 10 і грэюцца на сонцы... Сама тэрыторыя лічыцца прыродаахоўнай.

Акурат побач з музейнай тэрыторыяй поле, далей — лес. Зусім нядаўна калгаснікі цыстэрнамі вазілі сюды свіны гной і вылівалі бліз лесу. З «водарам», які стаў чутны паўсюль, яшчэ можна было мірыцца. Аднак з-за размернай колькасці ўгнаенняў лес пачаў сохнуць. Гэта вымусіла Цітовіча патэлефанаваць старшыні калгаса і папрасіць спыніць падвоз жыжы. Той згадзіўся і абяцаў вырашыць праблему. Аднак на наступны дзень не адзін, а адразу 3 трактары цэлы тыдзень вазілі гной.

І гэта яшчэ не апагей канфлікту: на невялікім полі каля музея старшыня хоча зрабіць аграгарадок і пераконвае мастака: «Аграгарадок упрыгожыць усё Заброддзе». На што Барыс Цітовіч адказаў: маўляў, ён скончыў Акадэмію мастацтваў і таму мяркуе, што аднатыпны бетонны праект наўрад ці будзе дарэчы акурат побач з музейным комплексам.

Такое неразуменне каштоўнасці музейнага прыродаахоўнага комплексу ў Заброддзі, які з'яўляецца адзіным у краіне, зусім не радуе. Шкада, што Цітовічу даводзіцца траціць свае сілы яшчэ і на вырашэнне гэтай праблемы. Аднак мастак дакладна ўсведамляе, што і дзеля чаго робіць:

— Не мы харошыя, што мы гэтым займаемся — увекавечваем памяць пра загінулых у гады Першай сусветнай вайны. У нас ёсць шанц рэабілітаваць сябе перад нашымі родзічамі. Не трэба казаць, што мы маладыя, што мы гэтага не рабілі — не ламалі, не руйнавалі. Раз мы маўчым сёння, не робім нічога, каб паправіць становішча, значыць, мы таксама ўдзельнікі гэтага развалу... Маладыя людзі, што загінулі тады за веру, цара, Бацькаўшчыну і за зямлю сваю, — яны сваю ўзнагароду атрымаюць ужо не ў гэтым свеце: той, хто за бліжняга загінуў, той ад Госпада атрымаў вянец. А з намі што?.. Атрымліваецца, што не для іх гэта трэба.

100 гадоў прайшло, ім не трэба было, і яшчэ 1000 пройдзе — таксама не трэба будзе. Але калі мы гэтага не зробім, то пасля будзем наракаць, што ў нас і дзеці не тыя, што і тое, і гэта не так... Калі мы з Рускаселля і іншых пахаванняў жвір вазілі на падсыпку свінакомплексаў, малочнатаварных фермаў і дарог, і гэтыя косткі цяпер ляжаць, і мы ездзім па іх на добрых дарагіх машынах, дык што нас можа чакаць у будучыні?.. Размова ідзе пра тое, што ёсць шанц, каб гэты лёд у нашых сэрцах хоць трошкі растапіць.

Для ўвекавечвання гэтай вайны неабходна не шмат. У будаўніцтве гіганцкіх музеяў ці помнікаў патрэбы няма. Справа ў тым, што ў Расіі, напрыклад, фронту не было. Бо фронт ішоў менавіта па нашай тэрыторыі, а таксама ў Прыбалтыцы, ва Украіне, Заходняй Еўропе. Таму трэба проста музеефікаваць рэшткі Першай сусветнай вайны, якія ў нас захаваліся, і гэта будзе больш танна. Важна і тое, што гэтыя рэшткі даволі значныя. Ёсць фартыфікацыйныя збудаванні, доты, бліндажы, акопы, пахаванні — усё гэта сёння рэальна ўбачыць.

Варта весці размову і пра мемарыяльны, гістарычны турызм. Чалавек можа рухацца па лініі фронту, а экспазіцыйныя цэнтры, такія, як у Заброддзі, могуць размяшчацца пры выканкаме ці мясцовым клубе.

Наша памяць пра Першую сусветную вайну дзякуючы музеефікацыі лініі фронту яшчэ можа быць рэальнай, непадробленай ды нават вельмі змястоўнай. І, кіруючыся на адпачынак да возера Нарач, мы будзем разважаць не толькі пра тое, ці можна там купацца, але і пра тое, што сімвалізуюць сабой чырвоныя ягады суніц і брусніц абапал дарогі ў лесе...

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Баі за Вілейку

У верасні 1915 года ішлі жорсткія баі за Вілейку. Вайсковую групу ўзначальваў генерал-лейтэнант Нікалаеў. 1915-ы лічыўся годам агульнага адступлення рускага войска. Аднак гэта не былі ўцёкі: расійская армія дабілася таго, што адступіла ў тым напрамку, у якім было задумана, захавала абозы. Менавіта на вілейскай зямлі ішлі апошнія баі маневранай вайны і пачалася вайна пазіцыйная, або акопная. Супрацьлеглыя бакі выкапалі акопы, працягнулі калючы дрот — у такім выглядзе лінія фронту прастаяла амаль 3 гады. Адолець яе ўжо не змаглі. Імператар Мікалай II пасля гэтых падзей даслаў асобную тэлеграму, у якой дзякаваў усім войскам, якія змагаліся ў баях восенню 1915 года.

Барыс Цітовіч дэманструе галаўныя ўборы нямецкіх і рускіх салдат.

Фотаздымак часоў Першай сусветнай.

Экспазіцыя і газавы балон.

Новыя віды зброі

Кулямёты, агнямёты — артылерыю «навяснога» агню сталі выкарыстоўваць менавіта ў гады Першай сусветнай вайны. Дагэтуль салдаты маглі хавацца ў акопах, і палявая артылерыя, якая б'е гарызантальна, нанесці вялікай шкоды не магла. А ад артылерыі навяснога агню акопы ўжо не абаранялі.

Упершыню з'явіліся танкі. Іх канструкцыю некаторыя спецыялісты звязваюць з неабходнасцю разбураць агароджы з калючага дроту, якія былі каля акопаў. Ёсць здымкі Вішнева, Нарачы, дзе ідуць 3 паласы дроту: кожная — гэта 10 ліній. Пехацінцу пераадолець такіх 30 ліній было вельмі цяжка. Каб прабіцца, трэба было выпусціць каля 1000 снарадаў. Са з'яўленнем танкаў такі від абароны ўжо слаба дзейнічаў.

Камень каля падмурку капліцы.

■ На кантролі

ПАМІРЫЦЦА ПРАЗ СУД І ПА ВІДЭАСУВЯЗІ

Пагадненнем бакоў у судзе Гомельскай вобласці завяршаецца кожная другая справа. Пра гэта расказаў старшыня гаспадарчага суда вобласці Мікалай ДАНЧАНКА. Закон аб медыяцыі, які зараз знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі, павінен даць магчымасць працаваць і пазасудовым медыятарам, лічыць Мікалай Анатольевіч. Зараз справай пагадненняў займаюцца судовыя прымірыцелі — спецыялісты гаспадарчага суда:

Прэс-канферэнцыя ў гаспадарчым судзе Гомельскай вобласці.

— Мы штодзень мірым суб'ектаў гаспадарання самай рознай формы ўласнасці: і дзяржаўнай, і прыватнай. Урэшце яны знаходзяць кампраміс, заключаюць міравое пагадненне; суд робіць высновы, наколькі яно адпавядае заканадаўству, пасля чаго вытворчасць па справе прыпыняецца. З пачатку 2013 года прымірэнчая працэдура выкарыстоўвалася па кожнай другой з разгледжаных абласным дзяржсудом спраў. Амаль кожная другая спрэчка завяршылася пагадненнем бакоў. Выніковасць адпраўлення прымірэнчых працэдур складае 82% і з'яўляецца самай высокай у рэспубліцы.

Дарэчы, шырокае ўжыванне дасудовага ўрэгулявання спрэчак вызваляе суддзяў ад працы, звязанай з падрыхтоўкай і правядзеннем судовых пасяджэнняў, што, у сваю чаргу, памяншае тэрміны разгляду спраў. Акрамя таго, прымірэнчая працэдура сведчыць пра знойдзены бакамі кампраміс. У любым выпадку гэта лепш, чым суд, пасля якога адзін з бакоў застаецца незадаволеным.

— Здараецца, што два суб'екты дзяржаўнай уласнасці складаюць дагавор, дзе прапісаны вялікія штрафныя санкцыі, — адзначае Мікалай Данчанка. — Атрымліваецца, што кіраўнік не адказвае за тое, якія матэрыяльныя страты панясе потым суб'ект гаспадарання. Ёсць факты, калі такое заключэнне дагавораў прыводзіць да даволі значных страт у выглядзе спагнання працэнтаў за карыстанне грашовымі сродкамі. Цяпер мы амаль выключылі падобныя інцыдэнты.

Што да трацейскага суда, які створаны на базе Гомельскага абласнога саюза наймальнікаў, ён існуе толькі на паперы — у Гомельскай вобласці не было разгледжана ніводнай справы. Хаця чакалася, што трацейскае правасуддзе разгрузіць афіцыйныя суды. Прынамсі, трацейскія суды не ўваходзяць у судовую сістэму, у іх менш фармальнасцяў, і сама працэдура абыходзіцца танней. Мікалай Данчанка мяркуе, што, магчыма, суб'екты гаспадарання, па традыцыі, больш давяраюць дзяржаўнаму суду.

Дарэчы, гаспадарчы суд Гомельскай вобласці падчас правядзення пасяджэнняў вельмі актыўна карыстаецца відэасувяззю: удзельнікі працэсу бачаць адзін аднаго на экранах манітораў, якія ўсталяваны ў залах. Відэасувязь наладжана з усімі буйнымі гарадамі краіны. Спецыяльная апаратура дазваляе разгледзець у падрабязнасцях не толькі людзей, але і кожны неабходны дакумент.

— З пачатку года праведзена 167 відэапасяджэнняў. Многія просяць менавіта ў такім рэжыме разглядаць іх справу. Пры гэтым судом выкарыстоўваецца ўласнае праграмнае забеспячэнне, сігнал перадаецца па абароненых каналах. Мы чакаем і пераходу на электронны дакументаабарот. Як толькі пачне дзейнічаць закон аб электронным подпісе, дакументаабарот значна павялічыцца. Зараз мы нясём вельмі вялікія паштовыя расходы: штодзень даводзіцца адпраўляць 700-900 заказных лістоў з уведамленнем — як патрабуе заканадаўства.

Рашэнні гаспадарчага суда па многіх справах прымаюцца на падставе заключэння экспертызы. Часта для высвятлення акалічнасцяў патрэбна некалькі месяцаў. Старшыня гаспадарчага суда Гомельскай вобласці Мікалай Данчанка гаворыць, што нярэдка ўзровень правядзення экспертыз вельмі сумніўны, а некаторыя заключэнні можна тлумачыць дваяка. Менавіта таму прыходзіцца прызначаць іншую экспертызу, выклікаць іншых спецыялістаў:

— Мы вельмі спадзяёмся, што створаны ў рэспубліцы адзіны экспертны орган зможа палепшыць стан спраў у гэтай сферы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара

■

■ Хатняя эканоміка

КАЛІ НЕ ЎСЁ ДА ЛЯМПАЧКІ...

Чым замяніць лямпу напальвання? Што такое святлодыёдная лямпа? Як правільна выбраць цёплае акно? Як менш плаціць за ваду? Чаму мы нярэдка спажываем так многа электраэнергіі? Адказы на ўсе гэтыя пытанні цяпер можна будзе адрасаваць спецыялістам Грамадска-кансультацыйнага цэнтра па пытаннях энергазберажэння і аднаўляльнай энергетыкі, які адкрыўся ў Мінску. Прычым атрымаць інфармацыю можна будзе фактычна не выходзячы з дому — па тэлефоне або электроннай пошце. А калі зручна — то можна прыехаць па бясплатную індывідуальную кансультацыю ў офіс, дзе працуюць таксама энергаэфектыўная бібліятэка і выстава.

Ідэю стварэння Грамадска-кансультацыйнага цэнтра беларускія эколагі падгледзелі ў Швецыі, дзе «энергетычныя дарадцы» падказваюць людзям, што можна змяніць у іх гаспадарцы для эканоміі. Энергаэфектыўнасць — гэта не тавар, які можна купіць у магазіне, а характарыстыка прадукту. І кожны спажывец можа выбраць больш ці менш энергаэфектыўны тавар і паслугу. Разабрацца ў такіх спецыфічных нюансах насельніцтву дапамогуць спецыялісты цэнтра.

— Нам бы хацелася, каб у будучыні аналагічныя кансультацыйныя цэнтры былі арганізаваны пры ўсіх ЖРЭА і буйных ЖЭСах, — дзеліцца планамі **дырэктар Цэнтра экалагічных рашэнняў Яўген ЛАБАНАЎ**. — А пакуль мы гатовы адказваць на пытанні, якія будуць паступаць з усіх куткоў Беларусі.

Графік работы Грамадска-кансультацыйнага цэнтра па пытаннях энергазберажэння і аднаўляльнай энергетыкі: панядзелак—чацвер з 10 да 17 гадзін. Задаць пытанне можна па тэлефоне (017) 334 18 15, электроннай пошце energy@ecoidea.by або асабіста ў мінскім офісе, размешчаным на праспекце Машэрава, 9-1/1, пакой 111.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

■ Сітуацыя

Кіраўніцтва ЗАТ «Магазін «Талін» абвяргае інфармацыю аб рэйдарскім захопе

Кіраўніцтва закрытага акцыянернага таварыства «Магазін «Талін» заяўляе, што інфармацыя, прадастаўленая журналістам былым дырэктарам гандлёвага прадпрыемства аб яго рэйдарскім захопе (матэрыялы з гэтай інфармацыяй размясцілі некаторыя інфармацыйныя агенцтвы, друкаваныя і электронныя СМІ), не адпавядае рэчаіснасці. Пра гэта гаворыцца ў лісце (ён падпісаны дырэктарам згаданага прадпрыемства Ю.І. Вярзнічам), які быў дасланы ў рэдакцыю «Звязды».

